Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 60 к. „ 3 „ 2 р. 70 к. „ 6 „ 4 р. — к. „ 1 год 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародзяе — 20 к. масковы — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок капярэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок капярэлі перад тэкстам 1 р. — к. За радок капярэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Скідкі на 50 проц. дазваляе. Зьмяшаны тэрмін бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант 35 кап. За кожны дадатковы 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант 15 „ За кожны дадатковы 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб. радок.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ў ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА — № 259 (2748) Пятніца, 15-га лістапада 1929 г.

154 кр. "Савецкая Беларусь" Одесса, Пастера 13, госуніверсітэт. публічн. бібліотека. отдѣл. сѣрік. адзін экз.

Аб скліканьні 2 Сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР IX скліканьня.

2-я Сэсія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР IX-га скліканьня склікаецца 20-га лістапада 1929 г. у гор. Менску.

ПАРАДАК ДНЮ НАСТУПНЫ:

1. Кантрольныя лічбы на 1929-30 год.
2. Дзяржаўны бюджэт 1929-30 году:
   а) Даклад СНК БССР;
   б) Садаклад Бюджэтнай камісіі ЦВК БССР;
   в) Выкананьне бюджэту за 1927-28 год.
3. Аб калектывізацыі сельскай гаспадаркі.
4. Аб чыстцы савецкага апарату.
5. Інфармацыя аб рэарганізацыі Віцебскай акругі ў вопытна-показальную.
6. Інфармацыя аб усебеларускай сельска-гаспадарчай выстаўцы.
7. Аб утварэньні Народнага Камісарыяту Земляробства СССР.
8. Зацьверджаньне важнейшых пастаноў, прынятых у пэрыяд паміж сэсіямі ЦВК.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ХАЦКЕВІЧ.

Аб пленуме Бюджэтнай Камісіі ЦВК БССР

Пленум Бюджэтнай Камісіі ЦВК БССР адбудзецца 20-га лістапада 1929 г., а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні ЦВК БССР. (Вялікая заля пасяджэньняў).

ПАРАДАК ДНЮ:

1. Аб выкананьні дзяржаўнага бюджэту БССР за 1927-28 бюджэтны год.
2. Дзяржаўны бюджэт БССР на 1929-30 г.

На пленум запрашаюцца акрамя членаў бюджэтнай камісіі, кіраўнікі наркаматаў і зацікаўленых цэнтральных устаноў БССР.

САКРАТАР БЮДЖЭТНАЙ КАМІСІІ ЦВК БССР
А. БРУШКОЎ.

Больш увагі Віцебшчыне.

...райшло, прыблізна, ужо каля мя..., як увесь савецкі апарат Віцебшчыны работае па новаму, работае па ...й рэарганізаванай сыстэме. Зразу... што цяпер яшчэ цяжка падво... вынікі работы новага рэарганізаванага апарату. Дый калі-б зараз ...ца за такую работу — за падвядзе... вынікаў, дык зразумела, што ...не дало-б належнага разуменьня ... наколькі рэарганізаваны апарат ...пытна-показальнай акрузе спра... з сваёю работай, наколькі апа... выканаў гэтыя задачы, якія ста... перад ім у сувязі з запатрабаваньнямі нашага часу, калі ідзе ка... я ломка сельскай гаспадаркі, калі ...ысловасьць пераходзіць на не... ыўны рабочы тыдзень, на сямі... ны рабочы дзень, калі шырока ...рнулася сацыялістычнае спаборніцтва.

...раўда, менавіта апошняе паставі... задачу перад нашым апаратам аб ...ганізацыі і аб набліжэньні яго да ...да ўсяе работы на сацыялістыч... будаўніцтву, і канешне, пад та... пунктам погляду трэба падыхо... да разгляду пытаньня аб тым, ...овы апарат справіўся з сваёй ...гай.

...та, зразумела, будзе зроблена з ...м часу, але сёньня трэба пагля... і высьветліць другія пытаньні, ...я трэба зацікавіцца тым, як ...шла рэарганізацыя, як пазнаём... рабочыя і служачыя гораду, ...кі і бядняцка-сераднацкія масы ... з задачамі рэарганізацыі. Сёньня ...наглядзець як пачаў сваю рабо... овы апарат, якія ўзаемаадносіны ...ж яго часткамі, якія адносіны да ...бскай вопытна-показальнай акру... боку цэнтральных устаноў і парт... таў.

...жніўні пачала работаць урадавая ...сія па рэарганізацыі савецкага ...ату ў Віцебскай акрузе. Пытаньне ...арганізацыі прапрацоўвалася ў ...сіях, на пленумах сельсаветаў, на ...ных зьездах саветаў, але шырока...рыцягненьня да гэтае справы пра... ых мас гораду і вёскі ня было. Уся ...ганізацыя была прароблена рукамі ...аў камісіі, рацыяналізатарамі, кі... ікамі акруговых і раённых уста... Прафсаюзы, шырокая маса рабо... батракоў, беднякоў у гэтай спра... рымалі слабы ўдзел.

...ногія, ня толькі сяляне, але па... і рабочыя ня ведаюць пра рэар... ацыю, а калі і ведаюць, дык па ...лышцы". Бо дагэтуль, нават, і ..., як акруговы, так і цэнтральны, ...вылучаў увагі рэарганізацыі апа... ў Віцебшчыне. Гэтыя памылкі ...а неадкладна-ж выправіць.

...рэба зараз-жа разгарнуць работу ...растлумачэньню пастановы ЦВК і ... БССР пра рэарганізацыю акру... раённай сыстэмы кіраўніцтва Ві... кай вопытна-показальнай акругі, ...а, каб прафсаюзы, саветы, ячэйкі ...ы і комсамолу, настаўнікі і дру... арганізацыі і культурныя працаў... на вёсцы навялі сярод насель... ва папулярызацыю пастановы ...у. Трэба дабіцца таго, каб кожны ...чы, каб кожны батрак, бядняк і ...дняк ведаў у якія зьвеньні па... а апарату яму належыць зварач... ца з сваёй справай, бо яшчэ і ця... наглядаецца, што частка сялян... , наведаючы аб новых правах ... саветаў, зварачваецца ў райён па ...м дробных пытаньнях.

...сабліва важнае пытаньне, якое паў... а на Віцебшчыне ў сувязі з рэ... нізацыяй гэта пытаньне аб кадрах новых працаўнікоў і асабліва аб спэцыялістах. З акругі ў раёны да гэтага часу паслана толькі 25 работнікаў. Гэта вельмі і вельмі мала. А Менск у Віцебшчыну паслаў толькі 6 чалавек, гэта зусім мізэрны лік. А між тым у Віцебшчыне, у зьвязку з тым, што новая сыстэма работы, пры якой ускладняецца індывідуальная адказнасьць, і спэцыялізацыя патрабуюцца новыя кадры. Іх часткова Віцебшчына павінна атрымаць з цэнтру, другую частку трэба вылучыць з ліку рабочых і бяднейшага, актыўнейшага сялянства, напрадне прапусціўшы апошніх праз адпаведныя курсы.

Трэба зазначыць і на тое, што і тая частка працаўнікоў, якая ўжо работае, яшчэ недастаткова ўцяміла сваю ролю ў новым апараце, асабліва гэта востра адчуваецца ў раёнах. А так званыя, рацыяналізатары і акруговыя інспэктары яшчэ вельмі мала аказалі практычнай паказальнай дапамогі раённаму актыву.

Цэнтральныя-ж установы і наркаматы да апошняга часу зусім ня лічыліся з пастаноўкай работы на Віцебшчыне. Некаторыя камісарыяты нібы зусім ня ведалі пра рэарганізацыю і работалі «па старонцы». Пасылалі ня толькі абежнікі, але і больш каштоўныя рэчы (Наркамзем паслаў 15 быкоў) па няіснуючым адрасам.

Такія адносіны да Віцебшчыны трэба зьмяніць у корані. Трэба прыкаваць увагу ня толькі камісарыятаў, але і ўсяе савецкае грамадзкасьці да работы савецкага апарату на Віцебшчыне. Трэба каб і работнікі Віцебскае акругі больш надзяляліся вопытам свае работы з усімі працоўнымі БССР і нават СССР.

Мы ўжо аднойчы, у сваёй ранейшай перадавіцы на гэтаму пытаньню („С. Б." № 238 ад 17 кастрычніка) запрашалі ўсіх работнікаў віцебскага апарату ўсіх рабкораў, селькораў, рабочых, беднякоў, сераднякоў Віцебшчыны асьвятляць у нашай газэце работу новага апарату. Частка гэтых таварышоў адклікнулася на наш заклік, сёньня мы друкуем іх допісы. Чакаем і надалей матар'ялаў па гэтаму пытаньню.

РЫХТУЙЦЕСЯ ДА ПЕРАВЫБАРАЎ САВЕТАЎ.

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

АБ ПРАКТЫЧНЫХ МЕРАПРЫЁМСТВАХ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ПЕРАВЫБАРАЎ САВЕТАЎ У 1930 ГОДЗЕ.

У зьвязку з надыходзячай кампаніяй па перавыбарах саветаў, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Прапанаваць выканаўчым камітэтам і саветам БССР:

а) зараз-жа прыступіць і да 1 студзеня 1930 году правесьці праверку работы саветаў з пункту погляду выкананьня імі наказаў выбаршчыкаў. Праверка павінна праводзіцца праз рэвізійныя камісіі ў сельскіх і местачковых саветах і праз сэкцыі РСІ і рабочыя брыгады—у гарадзкіх саветах. У паказаны тэрмін саветам наложыць закончыць складаньне справаздач, абмеркаваўшы і зацьвердзіўшы іх на сваіх пленумах;

б) безадкладна распачаць справаздачасьць дэпутатаў перад сваімі выбаршчыкамі на адпаведных выбарчых вучастках з такім разьлікам, каб да пачатку агульных справаздач саветаў усе дэпутаты зрабілі справаздачы сваім выбаршчыкам;

в) да 15 сьнежня 1929 году перагледзець сетку выбарчых вучасткаў у бок далейшага разбуйненьня і пашырэньня іх колькасьці з тым, каб выбарчы вучастак у сельскіх мясцовасьцях ахапляў у сярэднім 200-250 чалавек насельніцтва. Цэнтры выбарчых вучасткаў пры магчымасьці павінны прыстасоўвацца да месца знаходжаньня савгасаў, калгасаў, фабрык і заводаў;

г) падаць статыстычныя весткі, а таксама і агульную характарыстыку аб складзе выбарчых камісій у наступным парадку і ў наступныя тэрміны: гарадзкія (акруговых гарадоў), сельскія і местачковыя саветы аб складзе адпаведных выбарчых камісій—у раённыя выканаўчыя камітэты да 5 сьнежня; райвыканкомы аб складзе ўсіх выбарчых камісій раёну і гарсаветы акруговых гарадоў аб складзе гарадзкой выбарчай камісіі—у акруговыя выканаўчыя камітэты да 10 сьнежня і акрвыканкомы аб складзе выбарчых камісій акругі—у цэнтральную выбарчую камісію да 20 сьнежня г. г.

Дакладна праверыць склад выбарчых камісій і пры выкрыцьці паасобных выпадкаў засьмечанасьці апошніх (маючы на ўвазе вопыт мінулага году) зараз-жа прыняць меры да выпраўленьня дапушчаных памылак;

д) даручыць гарадзкім, сельскім і местачковым выбарчым камісіям прыступіць да перагляду сьпісаў выбаршчыкаў і сьпісаў асоб, пазбаўленых выбарчага права, з такім разьлікам, каб за 20 дзён да пачатку перавыбараў гэтыя сьпісы былі канчаткова афармлены, а сьпісы асоб, пазбаўленых выбарчага права—апублікаваны да агульнага ведама, паводле інструкцыі аб выбарах у саветы;

е) забясьпечыць абавязковае правядзеньне ў час перавыбарчай кампаніі сходаў беднаты, батрацтва і жанчын, а таксама правядзеньне нарад і сходаў усіх грамадзкіх арганізацый, з абмеркаваньнем на апошніх задач перавыбарчай кампаніі і неабходнасьці актыўнага ўдзелу ўсіх працоўных у перавыбарах саветаў;

ж) даручыць усім выбарчым камісіям у працягу сьнежня месяца г. г. скласьці канкрэтныя каляндарныя пляны справаздачна-перавыбарчай кампаніі і правядзеньня зьвязаных з ёю мерапрыёмстваў.

2. Даручыць усім цэнтральным ведамствам і грамадзкім арганізацыям БССР у двухтыднёвы тэрмін распрацаваць канкрэтныя мерапрыёмствы аб удзеле падпарадкаваных ім устаноў і нізавых арганізацый у падрыхтоўцы і правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў.

Аб гэтых мерапрыёмствах у вызначаны тэрмін (2 тыдні) павінны быць пададзены весткі Цэнтральнай Выбарчай Камісіі.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ХАЦКЕВІЧ.

11 лістапада 1929 г.
г. Менск.

Цыркулярна.

УСІМ ВЫКАНАЎЧЫМ КАМІТЭТАМ, САВЕТАМ І КАМІСІЯМ ПА ПЕРАВЫБАРАХ САВЕТАЎ БССР.

У мэтах упарадкаваньня праходжаньня, скарэйшага разгляду і вырашэньня спраў па пытаньнях пазбаўленьня і аднаўленьня ў выбарчых правох, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР, у зьвязку з надыходзячай перавыбарчай кампаніяй, прапануе ўсім выканаўчым камітэтам, саветам і камісіям па перавыбарах саветаў кіравацца наступнымі паказаньнямі:

1. Прымаючы пад увагу неабходнасьць правядзеньня на мясцох шырокай масавай работы па перакладаньні і праверцы сьпісаў выбаршчыкаў і асоб, пазбаўленых выбарчага права, а таксама тое, што ў мясцовых і цэнтральных выбарчых камісіях ёсьць шмат неразгледжаных скарг па пазбаўленьне выбарчых правоў, цэнтральная, акруговая, гарадзкая, сельскія і местачковыя выбарчыя камісіі павінны ў працягу месяца закончыць разгляд усіх паступіўшых скарг на пазбаўленьне выбарчых правоў.

2. Для выкананьня гэтага, а таксама і своечасовага разгляду скарг па пазбаўленьне выбарчых правоў паогул, усе выканаўчыя камітэты і саветы павінны забясьпечыць тэхнічным абслугоўваньнем існуючыя пры іх выбарчыя камісіі, вылучыўшы з свайго апарату працаўнікоў пэрсанальна адказных за правільную пастаноўку справаводзтва па пытаньнях пазбаўленьня і аднаўленьня ў выбарчых правох.

3. Саветы, выканкомы і іх выбарчыя камісіі павінны растлумачыць насельніцтву, што з моманту апублікаваньня гэтае пастановы цэнтральнай, акруговымі і раённымі выбарчымі камісіямі ў далейшым будуць прымацца да разгляду толькі такія справы, якія ўжо разгледжаны ў бягучую кампанію 1930 году ў адпаведных інстанцыях, згодна арт. арт. 47, 48 і 49 інструкцыі аб выбарах у саветы, і якія пададзены праз гэтыя інстанцыі.

4. Улічваючы вялікую колькасьць паўторных скарг на пазбаўленьне выбарчых правоў ад асоб, хадайнічаньні якіх ужо разгледжаны і вырашаны Цэнтральнай Выбарчай Камісіяй і Прэзыдыумам ЦВК—устанавіць, што паўторныя скаргі і хадайнічаньні перад памянёнамі органамі па пытаньнях аб аднаўленьні ў выбарчых правох могуць прымацца да разгляду не раней як праз год пасьля вынесеньня апошняе пастановы, за выключэньнем тых спраў, па якіх выяўлены новыя раней невядомыя выбарчым камісіям акалічнасьці, або па якіх маюцца хадайнічаньні прафсаюзных ці грамадзкіх арганізацый.

Гэтыя справы павінны вырашацца ў належным устаноўленым інструкцыяй парадку.

5. Саветы і выканаўчыя камітэты павінны дакладна прытрымлівацца арт. 41 інструкцыі аб выбарах у саветы і не вырашаць, а таксама не накіроўваць вышэйшым органам спраў аб пазбаўленьні выбарчых правоў без абгрунтаваньня пастаноў аб пазбаўленьні выбарчых правоў прадугледжанымі арт. 41 інструкцыі дакумэнтальнымі данымі і вычэрпваючымі весткамі аб сучасным і мінулым сацыяльна-маёмасным становішчы і занятках скаргнікаў з дакладнай адзнакай часу і працягу кожнага заняткі і сацыяльна-маёмаснага становішча скаргнікаў.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

11-XI 1929 г., г. Менск.

СУПЯРЭЧНЫЯ ВЕСТКІ.

ШАНХАЙ, 13-XI. Афіцыйныя крыніцы заявяраюць, што нібыта пасьля ўпартых боек нанкінскае войска здолела з вялікімі ахвярамі адбіць Мінсян і распачаць наступ на Цянфынь. Наколькі гэта праўдзіва, цяжка сказаць, бо, водлуг вестак амэрыканскай газэты „Ґэнінг Пост", войска Гамінцьзюна ня толькі ня вызваліла Мінсяну, але захапіла пры дапамозе партызанскіх атрадаў, якія дзейнічаюць разам з ім, Ючжоу. Ад Мінсяну войска Гамінцьзюну наступае, водлуг вестак гэтай-жа газэты, на Ўсход і знаходзіцца нібыта за 7 міль ад Пэйпін-Ханькоўскай чыгункі.

Дапушчаючы праўдзівасьць нанкінскіх завярэньняў, агенцтва Сімбун-Рэнго зазначае, што адбіць Таньфынь для нанкінцаў будзе вельмі цяжка, бо Фынь-Юй-Сян згрупаваў у гэтым райёне 100.000 войска і надыход да гораду добра ўмацован.

Водлуг вестак Рэйтэра, у нанкінскім войску ня ўсё добра. На працягу апошняга тыдню адна за другой нанкінскія часьці, якія знаходзяцца ў цэнтры ваенных дзеяньняў у хэнаньскіх гарадох, на ўзьбярэжжы рэчкі Хан і Сяняне, перайшлі на бок Фынь-Юй-Сяна. Сярод часьцей, якія прыяжджаюць у Ханькоу, шмат непадзейных элемэнтаў. Чан-Кай Шы вярнуўся з фронту ў Ханькоу. Гэта разглядаецца, як адзнака цяжкага становішча, але трымаецца пад сакрэтам.

САЦЫЯЛІСТЫ МАНЭЎРУЮЦЬ

ПАРЫЖ, 13-11. У палаце дэпутатаў распачаліся спрэчкі па бюджэту. Сацыялісты падалі прапанову аб адхіленьні першага разьдзелу бюджэту, прысьвечанага бюджэту міністэрства фінансаў, каб падкрэсьліць неабходнасьць вывучэньня становішча дробных трымацеляў навык,

Прэм'ер Тард'е паставіў пытаньне аб давер'і, патрабуючы адхіліць прапанову сацыялістаў. Прапанова адхілена большасьцю 317-ці супроць 257-мі галасоў".

ВЫКРЫТ ПОЛЬСКІ ШПІЁН.

БЭРЛІН, 13-11. Водлуг паведамленьняў з Данцыгу, у данцыгскім судзе разглядалася справа расейскага эмігранта Бельскага, абвінавачанага ў пражываньні па фальшывым польскім пашпарце. Пры разглядзе справы выявілася, што Бельскі лічыўся на службе польскай разьведкі і што польскае дыпляматычнае прадстаўніцтва ў Данцыгу дзейна на'аджвае шпіянаж супроць СССР, а таксама супроць Нямеччыны

Гэндэрсон адказвае.

ЛЁНДАН, 13-XI. Рэйтэр паведамляе: „Дэпутат рабочай партыі Мільс запытаў Гэндэрсона, ці можа ён паведаміць, хто прызначан на пасаду пасла ў СССР і ці адбудзецца пасьля гэтага назначэньне консулаў ва ўсе буйныя цэнтры. Гэндэрсон адказаў, што на пасаду пасла СССР назначан Овій, але што ён ня можа яшчэ зрабіць паведамленьня аб зацьверджаньні консульскіх пасад.

Дэпутат рабочай партыі Мэтэрс запытаў Гэндэрсона, ці зроблены яму ў сувязі з аднаўленьнем дыпляматычных зносі з савецкімі рэспублікамі прадстаўленьні аб спыненьні антысавецкай прапаганды ў злучаным каралеўстве. Гэндэрсон адказаў: „Не, сар".

Кансэрватар Кінголі-Вуд запытаў міністра ўнутраных спраў, ці быў выдадзен дазвол на прыезд у Англію двум расейцам—Осіпаву і Слуцкаму—і калі быў выдадзены, дык ці ня можа міністр паведаміць, з якою мэтаю яны прыехалі і ці мае ён данясеньні аб іх дзейнасьці. Таварыш міністра ўнутраных спраў Шорт адказаў, што Осіпаву і Слуцкаму быў дадзен дазвол прыехаць у Англію ў якасьці дэлегатаў саюзу гарнякоў СССР па штогадзіннаю канфэрэнцыю аб'яднанага саюзу шатляндзкіх гарнякоў. На апошнюю частку запытаньня Шорт адказаў станоўча.

Кансэрватар Сьмітэрс запытаў, ці можа Гэндэрсон паведаміць у палаце вобшын, якія дамініёны адказалі ўраду на яго паведамленьне аб аднаўленьні дыпляматычных зносін з СССР і якія не адказалі, а таксама, якія дамініёны з гэтым згадзіліся і якія не. Гэндэрсон адказаў: „Як я ўжо залічыў 5-га лістапада, урады дамініёнаў былі поўнасьцю інфармаваны аб прапановах ангельскага ўраду і аб ходзе перамоў і ніводзін з іх ніводнага разу ня выказаў нязгоды з агульнай палітыкай, якое мы прытрымліваліся. Больш таго, усе яны выказалі гатоўнасьць па абаюдную згоду наконт прапаганды, накшталт той, якая падпісана ангельскім урадам».

Цьвёрдалобыя інструктуюць.

ЛЁНДАН, 13-11. На пасяджэньні палаты вобшчын кансэрватар Мартын Тычфільд запытаў міністра замежных спраў, ці зьвярнуўся ён да савецкага ўраду з запытаньнем, ці думае ён адмежавацца ад прапаганды, якую Камінтэрн праводзіць супроць Англіі.

Гэндэрсон адказаў адмоўна.

НАЧНОЕ РАДЫЁ.

ПОЛЬШЧА НАПЯРЭДАДНІ ФАШЫСЦКАГА ПЕРАВАРОТУ.

ВАРШАВА, 14-XI. У палітычных колах узмоцнена распаўсюджваюцца пагалоскі аб магчымасьці дзяржаўнага перавароту і гвалтоўнай зьмены канстытуцыі. Урадавы друк ня ўжывае ніякіх крокаў для таго, каб разьвеяць трывожны настрой. Дэпутат беспартыйнага блёку супрацоўніцтва з Урадам Мадкевіч заявіў у „Віленскім Слове", што пытаньне аб зьмене зьверху канстытуцыі вырашана, і спрэчным зьяўляецца толькі тэрмін абвяшчэньня новай канстытуцыі. Польскія кансэрватары адкрыта адабраюць магчымасьць дзяржаўнага перавароту. Некаторыя з кансэрватыўных газэт пішуць, што на палітычным небасхіле вырысоўваецца магчымасьць кіраваньня Польшчай бяз сойму наперакор існуючым законам. У палітычных колах у той-жа час ня губляюць надзеі на тое, што справа абыйдзецца без перавароту, і сьцьвярджаюць, што магчыма ўтварэньне новага ўраду, які будзе весьці палітыку міру ў адносінах да сойму, што азначала-б захаваньне рэжыму фактычнай дыктатуры. Зусім ясна, што ў выпадку атрыманьня ад ураду некаторых уступак, ППС, а таксама Дашынскі з радасьцю пайшлі-б на зьвязку з урадам і абвясьцілі-б, што польскі парлямантарызм захован.

Рэвалюцыйны ўздым рабочых за мяжой

Дэманстрацыі супроць белага тэрору.

НЬЮ-ЁРК, 10 11. Ва ўсіх гарадох Злучаных Штатаў адбываюцца масавыя маніфэстацыі супроць натаржнага рэжыму астрогаў у Вэнгрыі. У Нью-Ёрку і Кліўлендзе абураныя дэманстранты прайшлі перад памяшканьнямі вэнгерскіх консульстваў.

У Кліўлендзе дэманстрантаў атакавала конная паліцыя. На сходах пратэсту ўсюды ўхвалаюцца рэзалюцыі з патрабаваньнем вызваліць палітычных зьняволеных. У Нью-Ёрку камітэт адзінага фронту наладзіў прадоўжаньне кампаніі пратэсту з удзелам прафсаюзных арганізацый.

Правакацыйная заява ўласьнікаў капальняў.

ЛЁНДАН, 13-11. Асацыяцыя ўласьнікаў капальняў Ёркшыру агаласіла заяву, у якой зазначае, што асацыяцыя згаджаецца на ўрадавыя прапановы наконт даўжыні рабочага дню і каардынаванага збыту вугляю. Рашэньне ёркшырскіх уласьнікаў капальняў мае характар выкліку ў адносінах да рашэньня асацыяцыі ёркшырскіх гарнарабочых.

Вялікі ўздым сярод рабочых Фінляндыі.

ГЭЛЬСІНГФОРС, 13-11. У рабочых масах Фінляндыі панує вялікае абурэньне супроць цяжкага астрожнага рэжыму, устаноўленага для палітычных зьняволеных і выклікаўшага галадоўку ў катаржным астрозе ў Экенасе.

У Тамэрфорсе адбыўся мітынг пратэсту, які скончыўся сутычкаю між яго ўдзельнікамі і паліцыяй.

ЗДРАДНІКІ ПРАДАЛІ БАСТУЮЧЫХ.

ЛЁНДАН, 11-XI. Барацьба ў баваўнянай прамысловасьці Ёркшыру скончылася ў першай стадыі на карысьць прадпрыемцаў. У гэтым спрыяла нежаданьне прафсаюзнага кіраўніцтва праводзіць барацьбу адзіным фронтам і пазялічыць яе на тых фабрыках, на якіх заработак зьнізаецца.

Адзіным арганізатарам адпору зьяўляецца кампартыя, якая выдае ў гэтым рабіце штодзённы лісток „Дэй Уоркер" Кампартыя раіць рабочым не спадзявацца на нацыянальнае прафсаюзнае кіраўніцтва, а стварыць незалежныя камітэты дзеяньня зьнізу і дамагацца прыбаўкі шляхам забастоўкі, замест таго, каб пасьўна супрацьўляцца супроць зьніжэньня заработку. Праца спынена поўнасьцю толькі на адной фабрыцы, на некаторых іншых яна скарочана.

Крывавая сутычка рабочых з фашыстамі.

ВЕНА, 13-11. Учарайшая сацыял-дэмакратычная працэсія ў Вене з прычыны 11-х угодак аўстрыйскай рэспублікі прайшла бяз значных інцыдэнтаў. Хэймвэр выступіў у Вене толькі асобнымі групамі. Распарадчыкі, якіх кіравалі сацыял-дэмакратычнай працэсіяй, усюды ўгаварвалі рабочых не зварочваць увагі на правакацыі фашыстаў.

У Інсбруку атрады хэймвэру зьявіліся на працэсію ў оталяўных касках, узброеныя вінтоўкамі, з прыкручанымі штыкамі і напалі на групу маладых рабочых.

У Катцэльдорфе здарылася сутычка між фашыстамі і рабочымі, прычым адзін рабочы быў забіты фашыстамі. У Грацы рэвалюцыйныя рабочыя сустракалі працэсію хэймвэраў выгукамі „Нахай жыве Саюз Саюз, прэч фашызм". У некаторых месцах здарыліся сутычкі між фашыстамі і рабочымі.

Забастоўка трамвайных рабочых.

ПАРЫЖ, 4-XI. Трамвайныя рабочыя Ліёну распачалі ў суботу забастоўку пратэсту супроць зьніжэньня заработку на франк у дзень. Кіруючыя забастоўкаю рэфармісты прымушаны былі абвясьціць яе пад узмоцненым нажымам рабочых. Рабочыя дамагаліся забастоўкі ўжо ад палавы кастрычніка, калі прадпрыемцы абвясьцілі аб зьніжэньні заработку. Абвясьціўшы забастоўку, рэфармісты адначасна самі ўжываюць захады да правалу забастоўкі.

Галадоўка палітвязьняў.

ГЭЛЬСІНГФОРС 12-XI. 10-га лістапада зьняволеныя ў катаржным астрозе Экенэсу абвясьцілі галадоўку ў знак пратэсту супроць пячувана цяжкага астрожнага рэжыму. У галадоўцы ўдзельнічае больш 100 палітычных зьняволеных.

У абарону прафсаюзу.

НЬЮ-ЁРК, 1-XI. 1400 рабочых аборачных майстэрняў Форда ў Мэксіка-Сіці абвясьцілі забастоўку, патрабуючы прызнаньня прафсаюзу.

Абвастрэньне крызісу фашысцкай дыктатуры ў Польшчы.

Эканамічнае становішча Польшчы значна пагоршылася за апошнія месяцы. Галоўныя галіны польскай прамысловасьці тэкстыльная і вугольная—знаходзяцца ў стане нашыраючайся рэпрэсіі. Разьвіцьцё вызазу вугалю з Польшчы ўпіраецца ў міжнародную канкурэнцыю. Тэкстыльная прамысловасьць задыхаецца ў рамках, пастаўленых ёй вузкасьцю ўнутранага рынку, беднасьцю шырокіх мас. Тэлеграмы з Лёндану паведамляюць аб масавых банкроцтвах тэкстыльных фабрык. Адна толькі ваенная прамысловасьць працуе зараз у Польшчы поўным ходам. Яна мае сталага заказчыка—мілітарысцкую польскую дзяржаву. У адпаведнасьці з сваёй агульнай устаноўкай на хвалю супроць Савецкага Саюзу польскі фашызм не шкадуе грошы на ваенную прамысловасьць, на пабудову стратэгічных чыгунак і шосавых шляхаў. На ўтрыманьне арміі, паліцыі і ахранкі, на вялічэзныя субсідыі дзесяткам вайсковых і паўвайсковых арганізацый.

Востры недахоп капіталу адчуваецца ўжо шэраг гадоў. Спроба прыцягнуць чужаземны капітал праз прывабныя канцэсіі не ўдалася. Гаспадарчы крызіс надзвычайна цяжка адбіваецца на рабочай клясе Польшчы. Матар'яльнае становішча рабочых у сувязі з ростам дарагоўлі пагаршаецца з кожным днём. Надыходзячае ўздараженьне цэн на хлеб выкліча новую хвалю дарагоўлі на ўсёй краіне. Цярпліваcьць мас не зьяўляецца бязьмежнаю. Мэталёўцы, гарнякі, тэкстыльшчыкі, камунальнікі і дзяржаўныя служачыя падаюць эканамічныя патрабаваньні. Павялічэньне падаткаў і крызіс сельскай гаспадаркі выклікаюць узрастаючае нездаволеньне ня толькі беднаты, але і серадняцкіх гушчаў сялянства. Нацыянальнае прыгнечаньне, якое ўсё расьце, выклікае ўзрастаючы рух пратэсту і барацьбы ў украінскіх і беларускіх працоўных масах. Клясавыя канфлікты ўсё больш абвастраюцца. Расьце колькасьць дробных стычак і непаразуменьняў на асобных прадпрыёмствах. 5-га лістапада гарнякі ўсіх трох вугольных басэйнаў Польшчы з вялікаю аднадушнасьцю правялі аднадзённую забастоўку пратэсту супроць пастановы трацейскай камісіі.

Урадавы друк адзначыў, што сярод баставаўшых гарнякоў карысталіся посьпехам „камуністычныя агенты", якія заклікалі рабочых адсьвяткаваць угодкі Кастрычніка. А 7-га лістапада ва ўсіх прамысловых цэнтрах Польшчы, Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі значныя масы рабочых, ня спужаўшыся вінтовак і нагаек, дэманстравалі за краіну пралетарскай дыктатуры і за польскі Кастрычнік. На меры росту гаспадарчых перашкод, на меры рэвалюцыянізаваньня рабочых мас і сялянства, на меры абвастрэньня нацыянальна-рэвалюцыйнага руху Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі—растуць палітычныя перашкоды кіруючых зараз Польшчай колаў, паглыбляецца агульны крызіс фашысцкай дыктатуры.

Спрэчкі ў сойме, вядомая рэч, адбываюцца ні аб чым інакшым, як аб мэтадах выратаваньня фашысцкай дыктатуры. Яны зьяўляюцца галоўнаю прыкметаю разлажэньня лягеры. Супярэчнасьці ў фашысцкім ўнутры фашысцкага лягеру датычаць толькі пытаньня аб тым, якім парадкам перамагчы сучасны крызіс фашысцкай дыктатуры. Буйны капітал, як і ранай, падтрымлівае лінію Пілсудскага. Але на грунце нясупынна ўзрастаючага эканамічнага крызісу расьце нездаволеньне часткі дробнай і сярэдняй буржуазеі, якая знаходзіцца ў апазіцыі да ўраду. Гэтым і тлумачыцца звальненьне эн-дэкаў, народна-дэмакратычнай партыі, якая аб'яднае гэтыя элемэнты.

Нядаўнія муніцыпальныя выбары ў Пазнанскай і Помэрскай абласьцёх далі паражэньне пілсудчыкам і перамогу эн-дэкам. „Апазіцыя" эн-дэкаў ня мае, вядомая рэч, прынцыповага характару. Гэта партыя ўзмоцнена падкрэсьлівае іменна зараз сваю прыхільнасьць да фашысцкіх мэтадаў дыктатуры. Мушыная клапатлівасьць пэпэсаўцаў і дробна-буржуазных сялянскіх палітыканаў наваколо сойму, камічнае дваяборства пэпэсаўскага шэльмы Дашынскага з Пілсудзкім, нібыта дзеля абароны „гонару" польскага сойму,—усё гэта павінна толькі затушаваць перад масамі сэнс барацьбы, якая разгортваецца ў Польшчы між капіталам і рабочаю клясаю, барацьбы, на чале якой стаіць кампартыя.

Кіруючая «палкоўніцкая» зграя пілсудчыкаў памыкаецца ўсімі спосабамі ўмацаваць свае пазіцыі. З дню на дзень павялічваецца нажым на працоўных праз арбітраж, фашызацыю больнічных кас, мілітарызацыю чыгунак. Павялічваюцца рэпрэсіі супроць авангарду рэвалюцыйнага пралетарыяту—кампартыі. Павялічваюцца ваенныя падрыхтоўкі. У сувязі з гэтым на польскую кампартыю ўскладаецца адказная задача. Ідучы ў авангардзе пралетарыяту, яна вядзе яго да новых боек супроць фашызму і сацыял-фашызму. «На руінах фашысцкай дыктатуры—дыктатура пралетарыяту.

Прэч буржуазны сойм. Няхай жывуць саветы рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў».

Вось асноўныя лёзунгі польскай кампартыі ў сучасны момант.

„Правда".

Праца сярод беднаты—важнейшая галіна партыйнай працы.

Датэрмінавае выкананьне пяцігадовага пляну народнай гаспадаркі і культуры, згуртаваньне батрацкай і бядняцка-серадняцкай масы для рашучага наступу на кулака і выкарчоўваньня карэньня капіталізму ў вёсцы—асноўная задача працы груп беднаты.

Да акруговай канфэрэнцыі груп беднаты Менскай акругі.

Сёньня адчыняецца акруговая канфэрэнцыя груп беднаты. На працягу сваёй працы канфэрэнцыя падагуліць гадавыя дасягненьні па акрузе ў галінах выкананьня першага году пяцігадовага пляну разьвіцьця гаспадаркі і культуры Беларусі, дырэктыў партыі і Ураду па рэканструкцыі сельскае гаспадаркі на грунце калектывізацыі, па палепшаньню працы савецкіх устаноў і грамадзкіх арганізацый на вёсцы.

На падставе вынікаў нашых дасягненьняў выяўленьня недахопаў у рабоце, канфэрэнцыя груп беднаты павінна будзе намеціць найкарацейшыя шляхі выкананьня дырэктыў партыі і Ураду на пяцігодцы, па каляктывізацыі сельскае гаспадаркі, па палепшаньню працы сельскіх савецкіх і грамадзкіх устаноў, з пункту погляду кіруючай ролі ў іх груп беднаты і правядзеньня імі яскравай клясавай лініі, накіраванай на поўную абарону інтарэсаў батрацтва і вясковай беднаты, па больш рашучае пасьлядоўнае наступленьне на кулацкія элемэнты вёскі.

Мінулы 28-29 гаспадарчы год, які мы прайшлі пад знакам выкананьня дырэктыў XVI канфэрэнцыі УсеКП(б), XII-га зьезду КП(б)Б, характарызуецца вялікім рухам уперад па шляху разьвіцьця і прэтварэньня гаспадаркі і культуры Менскай акругі. Ня гледзячы на цяжкасьці зьвязаныя з рэканструкцыйным пэрыядам і паступленьнем на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі запраэктаваны пяцігадовы плян абёмы і тэмпы работы БССР ня толькі выкананы, але па раду галоўных галін гаспадаркі значна перавышаны. Напрыклад, плошча пад калгасамі за год павялічылася на 356 проц. Сярэдні разьмер калгасу дасягае 173 га замест 47 га у 27-28 годзе. Упяршыню з'арганізаваны на зямлях працоўнага сялянства буйныя калгасы, якія на плошчы перавышаюць 1000 га. Упяршыню пераходзяць у калгасы цэлыя мястэчкі і вёскі. Закантрактаваная плошча павялічылася на 72 проц., зернаачышчэньне на 200 проц., гэта зн., што ачышчана больш, чым на 50 проц. усяго пасеўнага матар'ялу. Забясьпечанасьць мінэральнымі ўгнаеньнямі павялічылася ў 2½ разы, пашырэньне пасяўной плошчы на 1,7 проц., падвышэньне ураджайнасьці на 18 проц. Каапэраваньне насельніцтва па спажывецкай каапэрацыі павялічылася на 33 проц., па сельгасп. каапэрацыі на 80 проц. Паянакапленьне спажывецкай каапэрацыі павялічылася на 100 проц., сельска-гасп. каапэрацыі на 119 проц.

У галіне народнае асьветы сетка школьных устаноў узрасла на 7 проц., павялічыўся ахоп школай дзяцей на 23,5 проц., колькасьць школ на 54 адзінкі.

Усе гэтыя дасягненьні зьяўляюцца вынікам максымальнай дапамогі з боку дзяржавы сельскай гаспадарцы, узмацненьня блёку батрацтва і беднаты з серадняком, узмацненьня вядучай ролі беднаты ў гэтым блёку, узмацненьня саюзу, большай дапамогі і кіраўніцтва з боку рабочай клясы вясковым арганізацыям у правядзімай імі рабоце. Пасьпяховы рост сельскай гаспадаркі, вялікі рух працоўнага сялянства ў калгасы лішні раз падцьвярджае правідловасьць генэральнай лініі партыі і абвяргае апартуністычна-капітуляцкую хлусьню правых ухілістаў аб „дэградацыі" сельскае гаспадаркі і няверы ў перабудову сельскай гаспадаркі на калектыўных пачатках.

Дзякуючы арганізаванасьці беднаты і моцнасьці бядняцка-серадняцкага блёку, шалёнае супраціўленьне кулацкіх і варожых элемэнтаў вёскі ў час давядзеньня пляну загатовак да асобных паселішч і кулацкіх двароў сустрэла з боку беднаты і серадняцкіх пластоў сялянства самы бязьлітасны адпор. Таму плянавае заданьне па загатоўках хлеба і бульбы амаль што ўжо цалкам выканана, аднак пралетарскія і паўпралетарскія элемэнты вёскі павінны прыняць усе зіхады да таго, каб прымусіць кулацкую і заможную частку вёскі ўсе лішкі здаць дзяржаве.

Побач з станоўчым бокам у разьвіцьці с.-г. працы на вёсцы, бязумоўна ёсьць многа і адмоўных, як-та: разьвіцьцё жывёлагадоўлі па акрузе не адпавядае тэмпу ўзьнаўленьня гаспадаркі і патрэбам прамысловасьці, неластаткова поўнае ажыцьцяўленьне знайшоў закон аб увядзеньні аграмінімуму, недастаткова чотка праводзіцца клясавая лінія савецкімі ўстановамі і каапэрацыйнымі арганізацыямі, а часта і зусім скрыўляецца, недастаткова рашуча вядзецца змаганьне з капіталістычнымі элемэнтамі ў сельскай гаспадарцы.

Нядаўна прайшоўшы пленум менскага АК КП(б)Б і АВК у кантрольных лічбах разьвіцьця народнае гаспадаркі і культуры па Менскай акрузе на 29-30 г. у галіне разьвіцьця сельскай гаспадаркі, на партарганізацыю і ўсю савецкую грамадзкасьць вёскі ўсклаў надта вялікія задачы; галоўнымі з іх зьяўляюцца: пашырэньне пасеўнай плошчы на 2,3 проц. пры росьце плошчы культурных траў на 19,4 проц., новых пасеў канюшыны на 99 проц. і сэрадэлі на 32 проц. Рост ураджайнасьці на 29-30 г. па індывідуальным гаспадаркам узьняць на 20 проц., па калгасам на 25 проц., па савгасам на 35 проц., супроць сярэдняга ўраджаю 27-28 г. Павялічыць стада буйнай рагатай жывёлы на 3,7 проц., павялічыць удзельную вагу маладняку ў стадзе да 40 проц., пашырыць плошчу калгасаў за кошт узбуйненьня існуючых і арганізацыі новых на 132 тысячы га, каб сярэдняя плошча аднаго калгасу была ня менш 250 га і каб пасеўная плошча аграмаджанага сэктару сельскай гаспадаркі акругі ў канцы 1930 году складала ня менш 15,3 проц. агульнай пасеўнай плошчы акругі.

Выкананьне пастаўленых пленумам АК КП(б)Б і АВК задач на 29-30 год патрабуе ад груп беднаты, як авангарду бядняцкіх пластоў вёскі, на якія апіраецца партыя ў працэсе ўзьнімай ёю рабоце, энэргічнай самаадданай працы, яшчэ большага арганізацыйнага згуртаваньня, яшчэ большай палітычнай сьвядомасьці, і пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый яшчэ большай рашучай барацьбы з кулакамі і іншымі варожымі элемэнтамі, якія імкнуцца сарваць калектывізацыю сельскае гаспадаркі і пасьпяховае выкананьне пяцігадовага пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі і культуры БССР.

Шырокім і дэтальным абгаварэньнем канкрэтных задач акругі, зьвязаных з выкананьнем пяцігадовага пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі і культуры, узмацненьнем тэмпу калектывізацыі сельскае гаспадаркі і палепшаньнем працы савгасаў і калгасаў, правядзеньнем прадстаячай перавыбарчай кампаніі саветаў, КСУ і ажыўленьнем іх дзейнасьці, падвышэньнем палітычнай сьвядомасьці і павялічэньнем удзелу беднаты ў жыцьці вёскі і груп беднаты ў працы савецкіх устаноў і грамадзкіх арганізацый на вёсцы, акруговая канфэрэнцыя груп беднаты павінна намеціць канкрэтныя мерапрыемствы па датэрміновому выкананьню пяцігадовага пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі і культуры. Рашучае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва на вёсцы, як сталы мэтад у штодзённай рабоце; палепшаньне ў прадстаячую перавыбарчую кампанію сацыяльнага складу сельсав. і КСУ, ажыўленьню іх дзейнасьці і ўнядрэньне ў іх работы большай яскравасьці, у бок максымальнай абароны батрацка бядняцкіх інтарэсаў і нажыму на кулацкія пласты вёскі, рашучае разгортванне самакрытыкі, як мэтаду ўскрыцьця хваробых бакоў у працы устаноў і арганізацый і палепшаньне іх работы забясьпечыць пасьпяховае выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы і выкарчоўваньня капіталістычных элемэнтаў.

П. Тамашэўскі.

Сёньня 15 лістапада а 10-й гадзіне раніцы

АДЧЫНЯЕЦЦА АКРУГОВАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ

груп беднаты Менскай акругі з абвесткай дню:

1. Аб пяцігадовым пляне разьвіцьця народнае гаспадаркі Саюзу і БССР з канкрэтным вызначэньнем задач для мясцовых арганізацый і ўстаноў.

2. Аб удзеле беднаты ў перавыбарах сельскіх саветаў і камітэтаў сялянскіх т-ваў узаемадапамогі.

3. Вынікі работы па рэканструкцыі сел. гаспадаркі і далейшыя задачы.

Канфэрэнцыя будзе праходзіць у памяшканьні Акрвыканкому (заля паседжаньняў).

Усім прыбываючым дэлегатам неабходна зварачацца ў агульную канцэлярыю АВК.

МЕНАКРУГКОМ КП(б)Б.

Ячэйка не ўявіла задач чысткі.

ЗАМЕСТ БАЛЬШАВІЦКАЙ САМАКРЫТЫКІ—КРУГАВАЯ ПАРУКА.

З пачатку працы камісіі па праверцы і чыстцы ячэйкі ЦВК, якая праходзіць ужо на працягу двух тыдняў, многія члены ячэйкі не аднесьліся, як належыць, да гэтай вельмі важнай справы. У справаздачным дакладзе аб становішчы і працы ячэйкі сакратар выпячваў пераважна станоўчыя моманты, пакідаючы ў цені адмоўныя. Таварышы, якія выступалі ў спрэчках закранялі адмоўныя моманты толькі зрэдка і нясьмела. А калі адна камуністка ўказала на моманты пратэкцыянізму, надхалімства і п'янства з боку некаторых партыйцаў і беспартыйных супрацаўнікоў установы, якія абслугоўвае ячэйка, і па перэгаваньне на гэта ячэйкай, дык сакратар ячэйкі тав. Корф, пасьля зачытаньня паседжаньня праверачнай камісіі, пачаў навучаць яе, што так выступаць ня трэба.

Ячэйка ведала пра злоўжываньні сваім службовым становішчам асобных адказных працаўнікоў і на гэта своечасова не рэагавала. Маўчаць партыйцы і беспартыйныя пра гэтых асоб нават і цяпер, калі яны «чысьцяцца».

Мелі месца факты скарыстаньня сем'ямі адказных працаўнікоў аўтамабіляй для паездкі на рэлігійныя сьвяты ў госьці да свякоў-заможнай шляхты. У гаражы сярод шафэраў працьвітае п'янства, у чым прымаюць удзел і некаторыя партыйцы, як Красін і інш. Скарыстаньне адказнымі працаўнікамі сваіх падначаленых у асабістых справах. Ёсьць і выпадкі падхалімства. Усе гэтыя факты ячэйцы вядомы, іх трэба было выкрываць і рашуча зьнішчаць, але ўсё гэта замазваецца. Моцна трымаецца сямейсьцьвенасьць і кругавая парука. У некаторых камуністаў ёсьць вельмі шкадлівы погляд, што маўчыць сакратар ячэйкі, маўчаць партыйцы-адказныя працаўнікі, прыходзіцца і нам маўчаць, бо „адзін у полі ня воін". Беспартыйныя таксама трымаюцца пасыўна і зацікаўленасьць іх часткаю напіжаецца. Быў выпадак зрыву паседжаньня праверкому з прычыны ня явукі беспартыйных.

Усе гэтыя факты сьведчаць, што самакрытыка ў ячэйцы ня была разгорнута, частка партыйцаў адносіцца да чысткі не з бальшавіцкай сур'ёзнасьцю і адказнасьцю.

Чыстка працягнецца ўжо больш тыдню, яшчэ ня позна справіць недахопы. Трэба разгарнуць і ўзьняць на належную вышыню самакрытыку, крытыкаваць па бальшавіцкі не пазіраючы на асобы, моцна ўдарыць па сямейсьцьвеннасьці, пратэкцыянізму, падхалімству і іншых хваравітых зьявішчах. Гэта будзе на карысьць далейшай працы ячэйкі.

Я. І—н.

Паскорыць тэмп працы.

(Вынікі праверкі і чысткі ячэйкі КП(б)Б Музтэхнікуму).

Папярэдняе азнаямленьне студэнцтва, выкладчыкаў і тэхпрацаўнікоў з задачамі праверкі і чысткі партыі спрыяла прыцягненьню да ўдзелу ўсіх беспартыйных, сабрала ўсю тэхнікумаўскую масу на сход па чысткі ячэйкі. Заля ўвесь час праверкі была набіта людзьмі. Актыўнасьць мас была падзвычайная, шмат выказвалася па дакладу ячэйкі і па кожнаму члену ячэйкі. Праверка зацягнулася на 8 вечароў, ня гледзячы на малую колькасьць членаў ячэйкі (10 чал.).

Выкладчыкі, якія выступалі ў спрэчках на справаздачы ячэйкі, падкрэсьлівалі, што ячэйка мала аддавала ўвагі настаўніцтву.

Студэнты падкрэсьлівалі, што ячэйка ня ўмешвалася ў мастацкую і акадэмічную працу тэхнікуму і слаба была пастаўлена выхаваўчая праца.

Былі і выступленьні шавіністаў і нацыянал-дэмакратаў. Да гэтых выступленьняў адносіцца: „беларуская песьня нягодна для вывучэньня ў тэхнікуме, ячэйка не павінна ўмешвацца ў мастацкую працу тэхнікуму", разам з гэтым іншыя данаўнялі, што «беларускія творы павінны выцясьняць усе іншыя і быць павінны толькі яны адны». У асноўным маса дала адпор гэтым поглядам.

Вынікі правяркому аб працы ячэйкі падкрэсьліваюць наступныя дадатныя моманты ў працы ячэйкі: разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва, пераход на бесперапынны тыдзень; вядзеньне рашучай барацьбы з правымі ўхілістамі і „левымі" заскокамі, барацьбы з пацдэмакратызмам, антысэмітызмам і шавінізмам.

У выніку адзначана слабая і недастковая праца і промахі, слабая беларусізацыя, слабае кіраўніцтва грамадзкімі арганізацыямі і тое, што ячэйка ня ўдзельнічала ў мастацкай працы.

Тэхнікум не дапамагаў прасоўваньню беларускай вёсьні ў тэхніку, рабочым мастакам, а самакрытыка вялася кампаніямі.

Адзначаючы дасягненьні і недахопы, правярком [illegible] погляд партыі на тэхнікум у наступных словах: Музычны тэхнікум па сваіх мэтах і задачах павінен быць асяродкам беларускай па форме і пралетарскай па зьместу музычнасьці і мастацтва і павінен выхоўваць мастакоў—грамадзкіх працаўнікоў. Тэмп працы як у мурох, гэтак і па-за сьценамі павінен адпавядаць тэмпу рэканструкцыйнага пэрыяду.

Гэтай мэтавай устаноўцы правярком падпарадкаваў шэраг практычных прапаноў.

Чыстка і праверка пазнаёміла блізка аднаго з другім камуністаў, выкрыла маючыяся недахопы, дала напрамак у працы, перабудавала ўсю працу ячэйкі і тэхнікуму на новы лад адпавядаючы рэканструкцыйнаму пэрыяду.

С. Вязін.

Распрацоўка дырэктыў ЦК УсеКП(б) аб кадрах працаўнікоў асьветы.

(На нарадзе актыву працаўнікоў асьветы пры ЦК КП(б)Б).

ПЕРАБУДУЕМ ПРАЦУ КУЛЬТУРНАГА СЭКТАРУ, ЗРОБІМ ЯГО САПРАЎДНЫМ ФРОНТАМ КУЛЬТУРНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ. НІЗАВЫЯ ПАРТОРГАНЫ ПАВІННЫ БОЛЬШ ЗАЙМАЦЦА ПЫТАНЬНЯМІ НАРАСЬВЕТЫ. ПАПОЎНІМ КАДРЫ АСЬВЕТНІКАЎ НОВЫМІ ПРАЦАЎНІКАМІ З РАДОЎ РАБОЧЫХ. БОЛЬШ ПАРТЫЙЦАЎ НА ПАПАЎНЕНЬНЕ ...

Узмацніць асьветніцкія кадры рабочымі.

Нарада працаўнікоў Асьветы пры ЦК КП(б)Б, якая адбылася на днях, абгаварыла шэраг пытаньняў культурнага будаўніцтва.

Адчыняючы нараду, тав. Сенкевіч у сваім уступным слове, спыняючыся на пытаньнях высунутых на абгаварэньне нарады, зьвярнае ўвагу на важнасьць пастановы ЦК УсеКП(б) па пытаньні ўзмацненьня працы органаў НК Асьветы.

— У той час, калі культурны сэктар значна адстаў,—гаворыць т. Сенкевіч,—пры наяўнасьці вострай клясавай барацьбы і на эканамічным і на культурным франтох нашага сацыялістычнага будаўніцтва, калі адбываецца змаганьне за выхаваньне новага чалавёка і новых кадраў, органы НК Асьветы, як цэнтр культурнай рэвалюцыі, набываюць вялізарнае значэньне.

Мы павінны перагледзіць усю структуру працы НК Асьветы, павінны зрабіць яе сапраўдным штабам культурнай рэвалюцыі, узмацніць іх работнікамі, галоўным чынам, з рабочага асяродку. Да гэтай справы належыць мабілізаваць усю пралетарскую грамадзкасьць. Трэба паставіць работу так, каб пачынаючы ад фабзавкома цэхавой ячэйкі, сельсавету і да вышэйшых звеньняў, справа культурнага будаўніцтва займала ўвагу, як партыйных, так і саюзных арганізацый, з шырокім уцягненьнем рабочых і працоўнага сялянства. Пытаньне пралетарскага асяродку ў складзе працаўнікоў асьветы адыгрывае ня меншую ролю, чым у іншых галінах нашага будаўніцтва. Узмацненьне рабочага і партыйнага ядра, зьяўляецца таксама нашай неадкладнай задачай.

У спрэчках прынялі ўдзел амаль усе таварышы, якія, выказваючы свае меркаваньні па таму ці іншаму пытаньню, уносілі шэраг практычных прапаноў.

Узьняць працу навукова-мэтадалёгічнага камітэту.

Тав. Панкевіч —у сваім выступленьні зьвяртаючы ўвагу нарады на пытаньня навукова-мэтадалёгічнага камітэту, прыводзіць прыклады аб заняпадзе гэтай галіны працы НК Асьветы.

Тая структура, якая зараз існуе ў навукова-мэтадалёгічным камітэце,—гаворыць тав. Панкевіч,—нікуды ня варта і калі прыходзіцца выдаць у сьвет тую ці іншую працу, яе нават німа каму прагледзіць як сьлед і зачастую наша літаратура выходзіць пры спасылцы на аўтарытэт аўтара без належнай марксысцка-пэдагагічнай прапрацоўкі. Нав. мэтадалёгічны камітэт, па маёй думцы, патрэбна перабудаваць па мэтаду РСФСР, г. зн. утварыць шэраг камісій па пасобных пытаньнях, якія павінны стала працаваць і адказваць за эту працу.

Наладзіць працу дасьледчага інстытуту пэдагогікі.

Другое пытаньне: у нас ва ўмовах Беларусі ніяк ня можа наладзіцца дасьледчы інстытут пэдагогікі, у той час калі гэта галіна асьветы ў РСФСР пастаўлена больш-менш здавальняюча. Тлумачыцца гэта адсутнасьцю належных кадраў і сродкаў. Аднак спасылацца на гэта ня варта, а патрэбна будзе і гэту галіну вырашыць у бліжэйшы час.

Недапушчальна і такое зьявішча, калі тыя таварышы, якіх мы пасылаем на вучобы ў ВНУ РСФСР, пасьля сканчэньня да нас ня зьвяртаюцца, а едуць у прамысловыя цэнтры іншых саюзных рэспублік.

Увага нізавых партзьвеньняў—асьвеце.

Тав. Платун. —Мне здаецца, што да гэтага часу нашы нізавыя партыйныя звеньні недастаткова зьвярталі ўвагі на культурнае будаўніцтва. Пры гэтым тав. Платун спыняецца на шэрагу прыкладаў няўважлівых адносін з боку паасобных арганізацый да культурнага будаўніцтва ў практычнай працы.

Баз удзелу шырокіх партыйных мас,—гаворыць прамоўца,—без уцягненьня сотняў, тысяч беспартыйных мас, мы не разгорнем належнай працы на фронце культурнай рэвалюцыі. Тыя мэтады працы, якія зараз існуюць у НКАсьветы, патрабуюць перабудовы. Нам патрэбна наладзіць сыстэму нашай працы так, каб апарат наш зьяўляўся чулым і гібкім і адпавядаў сапраўднасьці—цэнтрам культурнага асяродку.

Да рэчы—пра нашы кадры. Нашы кадры, папершае, малыя па ліку і зусім слабыя па якасьці. Мы аб гэтым павінны падзадумацца.

Недастатковасьць марксысцкага выхаваньня маючыяся кадраў і малы іх лік паогул прымушаюць нас прыняць у гэтым напрамку належныя меры. Маючыяся кадры ў нашых вузах стаяць у рамках вузкай спэцыялізацыі, г. зн. глядзяць толькі на сваю дысцыпліну ў выкладаньні, а ўвесь іншы працэс сацыяльных зьявішч праходзіць міма вушэй. Нам патрэбна будзе яшчэ шырэй ставіць пытаньне аб падрыхтоўцы і вылучэньні кадраў навуковых працаўнікоў з рабочага асяродку і партыйцаў.

Уцягнуць шырокія масы працоўных.

Пры НКАсьветы павінны арганізавацца шырокая і вузкая калегіі. У склад першай павінны ўвайсьці прадстаўнікі адрозных устаноў прадпрыемстваў і шырокіх колаў асьветніцтва. Функцыі гэтай калегіі будуць заключацца ў вырашэньні шэрагу прынцыповых пытаньняў нашай працы, што бязумоўна палепшыць усю працу НКАсьветы. Пры акруговых інспэктарыятах патрэбна скласьці саветы. Такія-ж саветы павінны быць і ва ўсіх нізавых звеньнях. Праз гэтыя саветы мы ўцягнем шырокія масы працоўных у асьветную працу, чым зацікавым іх у пытаньні культурнага будаўніцтва.

Больш партыйцаў у ВНУ.

Кажучы аб кадрах, тут патрэбна да таго аб чым гаварылі, дадаць тое, што ў нашых навучальных установах (пэдтэхнікумы і пэдфакі) вельмі малы процант партасяродку. Мы зараз мяркуем пастаўніць пытаньне перад нашымі пар... і камсамольскімі арганізацыямі, будучым навучальным годзе гэт... цант павялічыць да 70 проц., пас... адначасова пытаньне за лепшы са... падбор студэнцтва наогул. Значн... шаем матар'яльны бок студэнцт... лічваючы некаторую катэгорыю ... ды да 50 руб. у месяц з тым к... сьпечыць вучобу.

Мы зараз высоўваем пытаньне ... нэрыфэрыі НКАсьветы яго ад... цыйнай часткі.

Кіраваць працай сэкцыі ас...

Тав. Лабадаеў.—Існуючыя ... пры гарсаветах у гарадох і кул... пры сельсаветах у вёсцы ня мас... лага напрамку ў сваёй працы ... разьлікам, каб іх працу цесна ... з органамі НКАсьветы. Гэтыя ... сэкцыі пры належным кіраўніц... вінны зьявіцца тымі зьвеньням, п... магчыма прыцягнуць усю грама... у асьветную справу. У нас існу... яльна-культурная камісія пры РС... якой патрэбна таксама ўзмацніць... трэба сказаць і аб культсэкцыі ... пляну.

Далей прамоўца спыняецца на ... статковым удзеле ў справе ... нашай прэсы, на адсутнасьць сы... асьветленьні газэтамі пытаньняў ... асьветы і г. д.

Арганізаваць перападрыхт... райінспэктароў.

Т. Клімовіч.—Адным з хворых зья... якім прыходзіцца часта сустрак... працы НКАсьветы,—гэта яго бюд... частка. Месца асьветы ў бюджэт... ходзіцца адваёўваць, бо яго скуп... усіх бакоў ва ўсіх нашых устано... менш ідучага па лініі супраціў... Гэта асабліва наглядаецца ў акр... раёнах. Мне здаецца ўжо пара ... партыйным камітэтам на гэта зв... рэагаваць.

Тэарэтычная слабасьць раённых ... тароў адчуваецца ўсюды. Нам тр... ладзіць перападрыхтоўку раённых ... тароў тым ці іншым шляхам. Мэта ... была-б нават і завочная перападры...

Неабходна практыкаваць заслух... не справаздач школ на рабочых і ... скіх сходах, чым магчыма ўцягну... рокія масы ў справу асьветы.

Больш займацца пытаньн... асьветы.

Т. Некрашэвіч.—На мясцох мала ... ваюць пытаньні асьветы. Будучы ... рыфэрыі, я цікавіўся праверыць, н... акруговыя камітэты займаюцца ... пытаньнем. Аказваецца, што зусім ...

Наша акруговая і раённая інсп... дзякуючы таму, што яе загружаю... ністрацыйныя органы іншай працы ... зусім не займаюцца справай асьв... запытаўся ў аднаго інспэктара, як ... абстаіць справа з ліквідацыяй ніп... насьці, ён мне не адказаў, бо ня ... Затое гэты таварыш добра веда... абстаяць справы з самаабклада... спатканьнем нялёгкім і інш. пыта... адміністрацыйнага характа у, якім ... маецца наша інспэктура.

Збор закантрактаваных культур на Аршаншчыне праходзіць сл...

Выкананьне кантрактацыі па Аршанскай акрузе праходзіць вельмі слаба. Для некаторых толькі расьлін падыходзяць тэрміны здачы поўнасьцю, а для большасьці на 50 проц. Збор закантрактаванага выканан па ільно-насеньню на 88 проц., па аўсу—на 17 проц., па ячменю на 17 проц. і па бульбе на 49 проц. Ільно-валакно яшчэ толькі пачало паступаць. З гэтай агульнай колькасьці невялікая доля прыходзіцца і на калгасы, бо яны яшчэ мала здалі закантрактаванага. Па тым зьвесткам, якія маюцца ў акрузе, на 1 лістапада ўсімі калгасамі акругі здача закантрактаванага выканана: па аўсу на 8 проц., па ячменю—13 проц. і па бульбе на 0,83 проц. Патрэбна дадаць, што ў гэту колькасьць не ўваходзіць тое збожжа, якое павінна быць здадзена калгасамі па кантрактацыі, але з прычыны адсутнасьці ў крэдытных сельска-гаспадарчых таварыствах памяшканьняў для хаваньня насеннага зерня, гэта збожжа застаўлена таварыствамі ў калгасах, на мейсцы, а на кожны калгас, дзе застаўлена збожжа, ускладзен абавязак хаваньня яго да вясны. Гэта колькасьць збожжа ў лічбы выкананьня не ўвайшла і, такім чынам, патрэбна сказаць, што калгасы здалі па кантрактацыі значна больш, чым гэта паказана ў афіцыйных зьвестках.

Але ўсё-ж такі патрэбна сказаць, што процант выкананьня здачы закантрактаванага як наогул, так і ў калгасах зусім нездавальняючы.

Галоўныя прычыны такога слабага выкананьня месьціцца ў тым, што на мясцох крэдытныя таварыствамі і сельсаветамі, а таксама і райвыканкомамі, не належна зьвярталаса ўвага на выкананьне збора закантрактаванага. Усе чакаюць, што здача будзе ісьці сама па сабе, а пагэтаму ня прымаюць ніякіх мер і ня робяць ніякага націску на заможных. Па аўсу і ячменю да 15 лістапада павінна паступіць 50 проц. усяго закантрактаванага, а паступіла да гэтага толькі 17 проц.

Адзін толькі гэты прыклад сьведч... тым, што работа па збору закант... ванага на мясцох зусім не вязецца, ... дзячы на тое, што 23 верасьня ... акруговая нарада ўсіх старшынь ... ных сельска-гаспадарчых таварыств ... пытаньню аб зборы закантрактавана...

Асабліва дрэнна ідзе збор закант... ванага ў Крупскім, Баеўскім, Цн... скім, Смалянскім, Доўгавіцкім, Бра... чынскім, Пацолтаўскім крэдытных ... рыствах. Старшыням гэтых тавары... ужо абвешчаны суровыя вымовы з ... рэджаньнямі і з запясеньнем у пр... ныя сьпісы.

У сучасны момант і Акрсельсаюз ... выканком прымаюць цэлы шэраг ... прыёмстваў, каб справу выкананьня ... ру закантрактаванага паставіць на ... ную вышыню і плянавыя меркав... выканаць да тэрміну.

М. ШАЛАЕЎ.

Гульня ў рэзалюцыі, ці сур'ёзныя справы?

Практыка ажыцьцяўленьня пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы ў краіне вымагае большае і большае ўвагі і дбайнасьці ў працы ўсіх нашых савецкіх органаў і грамадзкіх арганізацый. Пасьпяховасьць ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва ўпіраецца ў пытаньне аб культурнасьці мас, у пытаньне аб граматнасьці.

На другім Усебеларускім зьезьдзе «Прэч Няпісьменнасьць» у сваёй прамове т. Чарвякоў зусім слушна зазначыў, што „значэньне ўсяе працы па ліквідацыі няпісьменнасьці для сацыялістычнага будаўніцтва з тых прыкладаў, што прыводзіліся некаторымі прамоўцамі, вельмі вялікае. Калектыў расчаўся, бо там ня было піводнага пісьменнага, каапэрацыя працуе дрэнна, бо насельніцтва няграматнае, рабочаму цяжка прыстасавацца да працы на полых машынах часта толькі таму, што ў яго няма самых элемэнтарных ведаў, значыць **усе пытаньні сацыялістычнага будаўніцтва ўпіраюцца ў пытан ні аб граматнасьці**" (падкрэслена намі).

Калі-ж мы зараз на другім годзе нашае пяцігодкі непасрэдна акунуліся ў шырока разгорнутае сацыялістычнае будаўніцтва, прыступілі да рэканструкцыі ўсяе народнае гаспадаркі на новых сацыялістычных падставах, дык адказнасьць і важнасьць задачы ліквідацыі няпісьменнасьці наўстала перад намі ва ўсёй яе шырыні. І адгэтуль зусім зразумелым зьяўляецца праца, якую мы правялі і мусім праводзіць у далейшым у напрамку арганізацыі грамадзкае думкі вакол пытаньняў ліквідацыі няпісьменнасьці і вогуле пытаньняў культурнае рэвалюцыі. Ясна, што ў які тэрмін і як мы здолеем ліквідаваць няпісьменнасьць, гэта ў значнай меры будзе разьвязваць усе галоўныя пытаньні культурнае рэвалюцыі. Будзе правільным сказаць, што на сёньняшні дзень пытаньне ліквідацыі няпісьменнасьці зьяўляецца актуальным пытаньнем.

За апошнія два-тры м-цы мы маем шмат паказальнікаў, якія сьведчаць аб шырокім уздыме зацікаўленасьці шырокіх колаў рабочае клясы і працоўнага сялянства пытаньнем ліквідацыі няпісьменнасьці. На сёньняшні дзень такія справы, як арганізацыя надзвычайных штабаў па культурнаму паходу і ліквідацыі няпісьменнасьці, як заключэньне ўмоў сацыялістычнага спаборніцтва ў галіне ліквідацыі няпісьменнасьці і іншае, яны пікога ня дзівяць, а зьяўляюцца зусім звычайнымі, яны толькі сьцьвярджаюць сапраўднае ўзьняцьцё ўвагі працоўных мас вакол пытаньняў ліквідацыі няпісьменнасьці. Усё гэта неабходна, патрэбна, бо такая буйная справа ня можа быць вырашана рукамі адзінак.

Партыя зрабіла заклік і працоўныя масы адазваліся на яго. Аднак ясна, адзін энтузіязм мас справы не вырашае. Ён зьяўляецца неабходным і рашаючым, але на посьпехі працы могуць і ўжо ўплываюць шэраг і шэраг другіх фактаў. Старыя формы і мэтады працы, паасобныя наскокі на раскіданых вучастках культурнага фронту з усяе дзейнасьці рабілі штучнасьць. І ў сучасны момант нам патрэбна „караным чынам перабудаваць усю сыстэму работы на падставе вынікаў вопыту, якія маюцца і дамагчыся плянамернай арганізацыі ўсяе работы па ліквідацыі няпісьменнасьці на грунце адзінага пляну, аб'яднаньня сіл і сродкаў і шырокай самадзейнасьці ўсіх арганізацый, што прымаюць удзел у ліквідацыі няпісьменнасьці", —так кажа рэзалюцыя ЦК УсеКП(б). Там-жа ў рэзалюцыі далей зазначан „недастатковы ўдзел прафэсыйных і каапэрацыйных арганізацый у справе ліквідацыі няпісьменнасьці... ЦК прапануе партыйным савецкім і прафэсыйным арганізацыям, а таксама „ПН" рашуча ўзмацніць тэмп ліквідацыі няпісьменнасьці".

Здавалася-б, што ўсё гаворыць аб тым, каб у адпаведнасьці рашэньням партыі ўсур'ёз прыняцца за рэалізацыю вынесеных рашэньняў, за практычнае іх ажыцьцяўленьне. А на справе?

На справе і да гэтага часу мы ня маем жадных вынікаў. Улічваючы вопыт мінулага, улічваючы рашэньні партыі, мы перабудавалі нашы формы і мэтады ў адпаведнасьці з галоўнай лініяй партыі сёньняшняга рэканструкцыйнага пэрыяду; мы стварылі грамадзкую думку; узьнялі настрой мас, бо рукамі аднаго т-ва „ПН" далека ня ўедзеш; мы дабіліся таго, што шэраг арганізацый, хто ніколі ня думаў займацца гэтай справай, вымушан пешта рабіць.

Можна сказаць, што сёньня ў нас рэдка можна знайсьці такую арганізацыю, дзе-б не стаяла пытаньне ліквідацыі няпісьменнасьці. І створан патрэбны настрой мас, і вывучана пытаньне, як практычна праводзіць працу, і арганізаваны штабы па культпаходу, і заключаны ўмовы па сацыялістычнаму спаборніцтву між шэрагам акругаў, але... на вялікі жаль у большасьці бачым прыгожыя словы, рэзалюцыі і дрэнныя практычныя вынікі.

Хутка будзе два м-цы, як павінна была распачацца праца, як трэба было скончыць „разговаривать разговоры", паклясьці канец гульні ў рэзалюцыі, а ўзяцца за выкананьне прынятых рашэньняў. Агульны-ж малюнак у галіне з ліквідацыяй няпісьменнасьці на мясцох на сёньняшні дзень можна характарызаваць наступнымі паказальнікамі:

а) у большасьці сеткі лікпунктаў яшчэ і да гэтага часу капчаткова не распрацаваны;

б) задаваленьне падручнікамі і прыладамі лікпунктаў пастаўлена з [illegible] вон дрэнна;

в) у большасьці поўная непадрыхтаванасьць да разгортваньня працы палітасьветных устаноў (пардэмы, хаты-чытальні);

г) Белдзяржвыдавецтвам і да гэтага часу ня выканана і чвэрці заказу аб падрукаваньні падручнікаў для лікпунктаў.

Хочацца спытаць, аб чым-жа сьведчаць прыведзеныя вышэй прыклады ў справе сапраўднай падрыхтоўкі да вядзеньня такой важнай справы? Аб чым сьведчаць факты, калі шэраг раёнаў Аршаншчыны пачынаючы з раённых савецкіх цэнтраў і канчаючы грамадзкім арганізацыямі з праступнай халатнасьцю адносяцца да справы ліквідацыі няпісьменнасьці? Такое-ж становішча не ў аднэй Аршаншчыне, яго можна наглядаць амаль што ў кожнай акрузе, у кожным раёне. Аб чым кажа шэраг лістоў з месц ад вясковага актыву, дзе ён не сустракае дапамогі на мясцох і за гэтай дапамогай зьвяртаецца аж у цэнтр?

Апошняе ў першую чаргу на фронце з ліквідацыяй няпісьменнасьці, хто глыбока разглядзеў існасьць сапраўднага сёньняшняга становішча ў гэтай галіне, таго яно ня можа ня трывожыць, той ня можа не сказаць, што і ў гэтым годзе мы будзем мець то-ж самае, што ў мінулым, што мы нашы пастановы апраўдаем.

Задаволіцца-ж вынікамі мінулага году мы не згадзімся, прынятыя пастановы мы мусім будзем апраўдаць, мы гэтага дамагаемся, бо нашай першай парукай, а яна рэальна, зьяўляецца вялікая самадзейнасьць і энтузіязм шырокіх колаў працоўных мас! Гэтая-ж самадзейнасьць шырокіх пластоў рабочае кл

ВЫКОЎВАЕМ НОВЫЯ ЎЗОРЫ ПРАЦЫ.

У Віцебскай акрузе праведзена поўная рэарганізацыя савецкага апарату.—Цэнтры работы перанесены з акругі ў раёны.—У акрузе засталіся вучот і пляніраваньне ўсёй гаспадарчай, культурнай і палітычнай работы.—Раённыя выканаўчыя камітэты пазбавіліся дробнай апекі. —Сельскія саветы атрымалі большыя правы.

У праве рэарганізацыі Віцебскай акругі ў вопытна-паказальную слабы ўдзел прынялі прафсаюзы.—Закон Ураду БССР пра рэарганізацыю акругова-раённай сыстэмы кіраўніцтва Віцебскай вопытна-паказальнай акругі слаба папулярызаваны сярод рабочых гораду, батракоў і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.—Цэнтральныя ўстановы і народныя камісарыяты не прыстасавалі сваёй работы да рэарганізаванага апарату.

БОЛЬШ УВАГІ ВОПЫТНА-ПАКАЗАЛЬНАЙ ВІЦЕБСКАЙ АКРУЗЕ, ЯКАЯ ПАВІННА ДАЦЬ НОВЫЯ ПРЫКЛАДЫ ПРАЦЫ ДЛЯ УСЯГО АПАРАТУ.

Задачы выканаем.

А ТАГО, НАКОЛЬКІ ХУТКА ХУТАРСКАЯ ВІЦЕБШЧЫНА АРГАНІЗУЕ СЫЯЛІСТЫЧНУЮ СЕЛЬСКУЮ ГАСПАДАРКУ І РАЗГОРНЕ ІНДУСТЫЯЛІЗАЦЫЮ, БУДЗЕ ВЫЯЎЛЯЦЦА КАРЫСНАСЬЦЬ НОВАЙ СЫСТЭМЫ У ВОПЫТНА-ПАКАЗАЛЬНАЙ АКРУЗЕ.

рацу па рэарганізацыі акругі ў тна-паказальную, ня гледзячы на г цяжкасьцяў, якія сустракаюцца кожнай рэарганізацыі, у асноў- трэба лічыць скончанай і, па падпрабленай працы ўжо можна ць некаторыя папярэднія вынікі. самай арганізацыі гэтай працы а адзначыць адсутнасьць належнай аўленасьці цэнтральных устаноў, кажучы ўжо аб іх практычным е ў працы па рэарганізацыі (асагэта адносіцца да Наркамфіну і амзему).

тыя наркаматы і па сёньнешні механічна «кіруюць» ліквідава- аддзелямі Акрвыканкому, Акрфа рза, насылаюць розныя патрэбныя патрэбныя абежнікі і лісты, г. зн. па лініі найменшага супраціў- я:—напісаў, а там хто-небудзь нае. Трэба думаць, што тавары- кіраўнікі гэтых паркаматаў і інш. альных устаноў улічаць важ- ць гэтага дзяржаўнага мерапры- а, безадкладна наладзяць належ- абставіны працы і ўвяжуць сваю у з Віцебскай акругай на падста- шэньняў ураду, якія маюцца.

працівалегласьць цэнтральным овам мы маем поўнае падтры- е ў працы па рэарганізацыі з нізавога савецкага апарату; су- алі і сустракаем падтрыманьне і у самаго насельніцтва, што аса- выявілася на надзвычайных раёзьездах саветаў.

рэчкі і пытаньні дэлегатаў скан- аваліся, галоўным чынам, нава- рэарганізацыі акругі і мелі строга вы характар. Пытаньні задаваліся мі. Закон ураду разгледжан і раны па костках. Працаўнікі аветаў цікавіліся тымі правамі, ў выніку рэарганізацыі атрым- ць сельсаветы.

катерую запужанасьць і непара- ьке выклікала рэарганізацыя су- льсьледчага апарату. Арганізацыя ніх таварыскіх судоў шмат кім лася ў тым сэнсе, што малапісь- му селяніну, або сялянцы, якія ць абраны ў склад гэтых таварыс- удоў, прыдзецца засесьці за вываўе артыкулаў Крымінальнага Ко- , што мажліва толькі людзям з ычнай асьветай.

ркамюсту трэба ў самым тэрміно- парадку выпрацаваць папулярнае кэньне аб гэтых судох, у вялікай касьці, ня менш 10.000 паасобні- распаўсюдзіць іх сярод насель- а.

ржвыдавецтву трэба ў хуткім па- шырока папулярызаваць закон аб рэарганізацыі акругі шляхам ьня гэтага закону ў папулярным тленьні з тыражом ня менш 000 паасобнікаў і распаўсюджя яго дарэмна сярод на- ьніцтва. Трэба дабіцца, каб кожны к і серадняк самага глухога кутка Віцебшчыны ведаў-бы аб гэтым дэкрэце.

Як і належала чакаць, у працэсе працы па перадачы апэрацыйных функцый акруговых аддзелаў—райвыканкомам,—а некаторых правоў райвыканкомаў—сельсаветам, выявілася шэраг тэхнічных цяжкасьцяй. Ва ўмовах Віцебшчыны гэтыя цяжкасьці зьяўляюцца ў недахопе ў некаторых раёнах жыльлёвых і іншых памяшканьняў. Перасоўваньне вялікай групы працаўнікоў з акругі ў раёны (адных, спэцыялістаў на сельскай гаспадарцы накіравана на сталую працу ў раёны звыш 100 чалавек) выклікае неабходнасьць аказаньня рэальнай дапамогі райвыканкомам у пабудове новых жыльлёвых будынкаў. У вырашэньні гэтай праблемы неабходна дапамога дзяржавы ў сэнсе павялічэньня бюджэтных асыгнаваньняў.

Моманты сацыялістычнага спаборніцтва дапамагалі ў рабоце па рэарганізацыі. Асабліва гэта адзначэцца ў пытаньнях калектывізацыі сельскае гаспадаркі. Сіроцінскі раённы зьезд саветаў прыняў рашэньне прыступіць да агульнай калектывізацыі раёну, за апошнія дні ў хутарскім Лёзьнянскім раёне 275 хутароў з'арганізаваліся ў адзін вялікі калгас з плошчай да 3.000 гэктараў, а «Краснознаменная Коммуна»—Чырвоны Сьцяг у Гарадоцкім раёне пашыраецца за лік удзячэньня акалічнага насельніцтва да 2000 гэктараў, у Сененскім раёне арганізуецца калгас на плошчы да 6.000 гэктараў. Адсюль ясна, што паказальнасьць раёнаў і акругі цалкам будзе выяўляцца ў тым, што хутарская Віцебшчына арганізуе сацыялістычную сельскую гаспадарку.

Дагэтуль ёсьць яшчэ шмат нявыразнасьці ў пытаньні кіраўніцтва цэнтральнымі ўстановамі акругі. Канкрэтныя моманты гэтага кіраўніцтва яшчэ ня выяўлены, асабліва гэта адчуваецца ў лясной гаспадарцы і па лініі Наркамгандлю. Трэба думаць, што тое разуменьне, якое мы заўважваем сярод некаторых працаўнікоў акрвыканкому, аб тым, што правільнае кіраўніцтва раёнамі мясьціцца ў пасылцы пісьмовых указаньняў кожнаму нават і дробнаму пытаньню, будзе зьнішчана і ў блытаніна, і непатрэбная перапіска ў працэсе працы—будзе спынена.

Як вялікую перашкоду ў працы трэба адзначыць непрыстасаванасьць дагэтуль сыстэмы сельска гаспадарчай крэдытнай каапэрацыі да новых задач. Згодна рашэньню СНК аб рэарганізацыі сыстэмы сельска-гаспадарчай каапэрацыі, крэдытным таварыствам перадаюцца функцыі разьліковых кас райвыканкомаў, але гэта яшчэ поўнасьцю не праведзена.

Ад хутчэйшага правядзеньня ўсіх задач будуць залежыць посьпехі нашай работы.

Сапрыцкі.

НА НОВЫХ РЭЙКАХ.

САВЕЦКІ АПАРАТ ВІЦЕБШЧЫНЫ РАБОТАЕ ПА НОВАЙ, РЭАРГАНІЗАВАНАЙ СЫСТЭМЕ.—ГЭТАЯ СЫСТЭМА НАБЛІЗІЛА АПАРАТ ДА МАС.—У СУВЯЗІ З РЭАРГАНІЗАЦЫЯЙ ВОСТРА СТАЦЬ ПЫТАНЬНЕ АБ КАДРАХ.

На новую сыстэму работы Віцебская акруга перайшла толькі ў другой палове кастрычніка. Падагульваць канчатковыя вынікі рэарганізацыі акругі яшчэ перадчасна, але ўжо зараз (пасьля трох тыдняў работы) магчыма, бязумоўна, канстатаваць цэлы шэраг перавагаў новай сыстэмы работы.

Зусім другі размах і характар прыняла работа гарсавету і райвыканкомаў, апарат якіх значна ўзмоцнен кваліфікаванымі працаўнікамі па розных галінах.

Дэцэнтралізацыя апэрацыйнай працы АВК і перадача адміністрацыйных і масмасных правоў РВК прывялі да максымальнага набліжэньня апарату да насельніцтва. АВК, які аслабаніўся ад адміністрацыйных і апэрацыйных функцый, ператварыўся ў орган, які ставіць перад сабой у асноўным задачы: кіраўніцтва, пляніраваньне, кантроль і праверку выкананьня.

У выніку рэарганізацыі, акруговы апарат значна скараціўся, і за яго кошт узмоцнен нізавы апарат, у асаблівасьці гарсаветы і сельсаветы.

	Да рэарган.	Пасьля рэарган.	Павялічэньне
Акр. апарат	441	220	—221
Гарадзкі	4	99	+ 95
Раённы	423	495	+ 72
Сельскі	317	422	+105
РАЗАМ	1185	1236	+ 51

Невялікае павялічэньне штатаў па акрузе, якое прыходзіцца, галоўным чынам, на сельсаветы, тлумачыцца тым, што ў апаратах сельсаветаў устаноўлены зусім новыя пасады статыстыкаў-рахункаводаў, якія не павінны быць прыняты пад увагу пры правядзеньні вынікаў рэарганізацыі апарату, таму што незалежна ад рэарганізацыі меркавалася значнае ўзмацненьне нізавога савецкага апарату.

Рэарганізацыя дала магчымасьць вырашыла матар'яльныя ўмовы працаўнікоў нізавога савецкага апарату. Новая складаная абстаноўка працы патрабуе павышэньня зарплаты нізавым работнікам апарату. Стаўкі старшынь і сэкратароў сельсаветаў з 28 руб. павышаны да 40, старшынь райвыканкомаў—з 90 да 120, адказных работнікаў раёну — з 70 да 110. Гэта дае магчымасьць забясьпечыць раёны больш кваліфікаванымі працаўнікамі.

Значна ўпрошчваецца і паляпшаецца тэхніка працы савецкіх устаноў.

Задача рэарганізацыі акругі мела на ўвазе не скарачэньне грашовых выдаткаў на ўтрыманьне апарату, а лепшае выкананьне дырэктыў партыі і ўлады раённым нізавым апаратам і набліжэньне савецкага апарату да насельніцтва.

Зараз, калі гэтае пытаньне тэарэтычна амаль вырашана, калі яно становіцца практыкай дню, ужо відавочнымі зьяўляюцца дадатныя бакі рэарганізацыі і тыя памылкі, якія зроблены ў гэтай справе.

Такія мерапрыемствы, як ліквідацыя фінкантролю, дзяржстраху, прынцыпы выкананьня клясавага бюджэту і г. д.,—ужо зараз, не чакаючы далейшай праверкі, магчыма было б распаўсюдзіць на ўсе іншыя акругі.

Прафсаюзы прынялі слабы ўдзел у рэарганізацыі апарату.

Але ўжо цяпер відаць галоўная памылка, якая дапушчана ў працы па рэарганізацыі акругі. Як падрыхтоўчыя работы, так і пераход да практычнага ажыцьцяўленьня, да працы па новаму—праведзены без належнага ўдзелу працоўных мас. Калі ўзяць прафсаюзы, дык яны амаль што не правялі абгаварэньня на сходах рабочых пытаньня аб задачах рэарганізацыі акругі. У рабочых колах ня створана думка, што рэарганізацыя далёка выходзіць за межы звычайнага мерапрыемства, што яна прадстаўляе сабою вопыт, маючы ўсесаюзнае значэньне. Таксама нельга лічыць здавальняючым удзел прафсаюзаў у практычнай працы, у працы па ажыцьцяўленьню пераводу акругі на рэйкі вопытна-паказальнай. Ня толькі шырокія рабочыя масы, а нават і працаўнікі тых устаноў, якія належаць да рэарганізацыі, ня ведалі аб пераходзе на працу па новаму і гэты пераход зьявіўся для іх нечаканым, бо ён быў зроблены надзвычайна хутка і бяз папярэняга абгаварэньня.

Шырэй самакрытыку вакол пытаньняў рэарганізацыі.

Вядома, што ў вёсцы ў гэтых адносінах справа абстаіць яшчэ горш. На днях былі лісты ад селькораў аб тым, што ў сельсаветах не праводзіцца ніякай растлумачальнай працы, што маюцца такія куткі, дзе аб рэарганізацыі акругі яшчэ нават і ня ведаюць.

Усё гэта, а таксама тыя недарэчнасьці, якія ўжо зараз відны, патрабуюць узьняць працу на абгаварэньню задач рэарганізацыі і маючуюся практыку ў гэтых адносінах.

Трэба разгарнуць самым шырокім чынам самакрытыку вакол пытаньня рэарганізацыі. Гэта дапаможа выкрыць цэлы шэраг недарэчнасьцяў, гэта будзе спрыяць унясеньню новых каштоўных прапаноў, якія дапамогуць правесьці ўскладзены на нас вопыт больш пасьпяхова.

Зараз стала вядома, што вэтлячэбніца, „Дом Селяніна" у час разьмеркаваньня ўстаноў, па іх падлегласьці АВК і гарсавету, засталіся прамінёнымі. Ёсьць такія наркаматы, якія нібыта ня ведаюць, што Віцебшчына перажыла рэарганізацыю і дасылаюць свае дырэктывы па старай намянклятуры.

Ул. Буслаў.

Гарсавет--поўны гаспадар гораду.

Ліст з Віцебску.

У сувязі з рэарганізацыяй акругі ў вопытна-паказальную, значна павялічылася роля Віцебскага гарадзкога савету.

Перш за ўсё на яго ўскладзены абавязак стаць паказальным саветам, максымальна ўцягнуць рабочую масу ў савецкае будаўніцтва.

Віцебскаму Гарадзкому Савету дадзены ўсе магчымасьці ажыцьцявіць гэта. Калі раней яго функцыі былі пераблытаны з акруговымі аддзеламі і ўстановамі, дык зараз яны вызначаны чотка і яскраза. Усе аддзелы і ўстановы акругі ліквідаваны. Акруговыя функцыі цалкам ускладзены на акрвыканком а ўся работа па гораду цалкам перададзена Гарадзкому Савету.

У сувязі з гэтым Гарадзкі Савет узмацніў працаўнікамі. Замест 3-4 сталых працаўнікоў, якія раней працавалі ў Гарсавеце, зараз яму дадзены інспэктары па кожнай галіне працы ў горадзе, адзіная канцылярыя і бухгальтэрыя, гарадзкая адміністрацыйная частка, міліцыя і г. д.

Праца Гарсавету пабудавана па сыстэме адказных выканаўцаў. У сувязі з гэтым ліквідаван аддзел камунальнай гаспадаркі. Яго функцыі разьмеркаваны паміж паасобнымі галінамі працы. Значна ўзрасла роля прэзыдыуму, пленуму і сэкцый Гарсавету.

У пляне працы Гарсавету адной з адказьнейшых задач стаіць шырокае ўцягненьне працоўных мас у практычную працу сэкцый.

Між іншых задач, якія ставіць перад сабой Віцебскі Гарсавет у наступіўшым гаспадарчым годзе, трэба адзначыць—пабудову 3-х шматкватэрных дамоў, электрыфікацыю гораду, шляхам пераводу прамысловасьці на энэргію Асінбуду, пашырэньне і поўную рэканструкцыю трамваю, пашырэньне і пераабсталяваньне вадаправоду, паленшаньне санітарнага становішча гораду і поўная ліквідацыя нянісьменнасьці.

Б.

Капірвучот у Віцебскай паказальнай акрузе.

(У парадку абгаварэньня).

Ад 1-га лістапада галоўная бухгальтэрыя Віцебскага Акрвыканкому перайшла на новы мэтад капіравальна-картачнага вучоту. У гэтым-жа месяцы тое самае будзе зроблена ва ўсіх райвыканкомах акругі. Каб не зрабіць шматлікіх памылак, якія маглі-б скампрамэтаваць паказальны вопыт у такой важнай галіне, як вядзеньне вучоту сацыялістычнай гаспадаркі акругі, неабходна завастрыць увагу над гэтым важным пытаньнем усёй грамадзкасьці, асабліва членаў ОРУ.

У кароткіх словах патрэбна сказаць, што галоўная бухгальтэрыя Акрвыканкому, за зацьверджанаму РСІ пляну, павінна складаць мясцовы бюджэт акругі і весьці вучот аб яго выкананьні, як у прыбытковай, так і выдатковай частцы. Апроч таго, яна ўлічвае ўсе асыгнаваньні, якія адпушчаюцца адпаведнымі Наркаматамі на ўтрыманьне устаноў, знаходзячыхся на дзяржаўным бюджэце (Наркамздраў, Наркамюст, Наркамасьветы, Наркамфін, Наркамзем, Наркампрацы, ЦСУ). Дзеля выкананьня ўсёй гэтай працы, ў склад выканаўчага апарату уваходзіць усяго толькі 7 працаўнікоў, замест ранейшых трох дзесяткаў. Вытлумачыць гэта карыснае зьявішча можна надзвычайнай простасьці вучоту, які замест шматлікіх кніг патрабуе вядзеньня толькі адпаведных картак, якія пішуцца на спэцыяльнай капіравальнай данцы ў двух паасобніках (другі паасобнік замяняе ранейшы журнал).

Гэта значыць, што ад умела рацыянальнай набудовы картак вучоту залежыць увесь посьпех працы бухгальтэрыі. Калі такой умеласьці ня будзе праяўлена з самага пачатку арганізацыі, дык загадзя можна сказаць, што вынікі працы будуць паказальна-дрэнныя.

Як-жа стаіць гэта пытаньне ў нашай Віцебскай акрузе? Тут увесь вучот ставіцца на засадзе універсальнай краткасьці. Ніякіх лішкаў, ніякай падрабязнасьці. Калі які Наркамат запатрабуе тыя ці іншыя зьвесткі аб выдатканьні адпушчанага крэдыту, дык ён такіх зьвестак ніколі не атрымае. Мяркуецца, што Наркаматы не павінны быць збытна цікавымі. Возьмем адзін прыклад.

Для вучоту адчыненага крэдыту заведзены карткі, у якіх паказваюцца па актыву і пасыву агульныя сумы асыгнаваньня. Для вучоту-ж фактычных выдаткаў у актыве заведзены асобныя карткі з невялікай дэталізацыяй выдаткаў па параграфах (ранейшая дэталізацыя, якая была заведзена РСІ, касуецца). Мала таго, што пры такой устаноўцы Наркаматы не атрымаюць у галавой справаздачы патрэбных ім для каштарысу зьвестак на дэталізацыі выдатковых сум, сама бухгальтэрыя ня можа хутка даць распарадчыку зьвестак пра тое, ці ёсьць яшчэ крэдыт па данаму параграфу. Дзеля гэтага яна павінна прагледзець ня толькі карткацэкуле, але зьвярнуцца яшчэ ў папку з адносьнікамі данага Наркамату. А калі дадаць, што пры такой блытаній устаноўцы ня выключэньня перавыдаткі па данаму параграфу, бо вучот адчыненага крэдыту, як сказана, вядзецца карткацэкай не па паасобным параграфам, а ў агульнай суме, дык неабходна прызнаць, што тут арганізатары зрабілі вялікую памылку.

Нажаль, мы ня можам тут застанаўляцца над усімі іншымі недахопамі арганізацыйнай сыстэмы, аднак і памянёнага даволі, каб відзець, што ўстаноўка на ўнівэрсальную краткасьць вучоту зроблена пасьпахова і можа павесьці да непажадана-кепскіх вынікаў.

Ян. Каменокі.

ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ.

Выправіць недахопы, замацаваць дасягненьні, паказаць узоры лепшай працы—зьяўляюцца чарговымі задачамі ў Віцебшчыне.

Перад працоўнымі Віцебшчыны пастаўлена надзвычайна складаная і адказная задача, якая патрабавала ўдумчывасьці і вывучэньня кожнай думкі, кожнага мерапрыемства, якое высоўвалася ў час падрыхтоўчай працы.

Асноўным прынцыпам рэарганізацыі акругова-раённай сыстэмы кіраўніцтва зьяўлялася дэцэнтралізацыя апэрацыйнай работы і максымальнае набліжэньне савецкага апарату да насельніцтва. З акрвыканкому зьняты ўсе адміністрацыйна-апэрацыйныя функцыі. За ім застаўлены функцыі кіраўніцтва вышэйшага апарату—пляніраваньне і праверка выкананьня. Цэнтралізацыя, пляніраваньне, пры дэцэнтралізацыі выкананьня плянаў паставіла праблему вучоту. Паўстала пытаньне зьнішчыць патоп зьвестак і справаздачнасьцяў, прыстасаваць статыстычныя распрацоўкі да праграм па пляніраваньню. З гэтай мэтай урадам БССР устаноўлена пляніра-статыстычнае бюро не як структурная адзінка, а як рабочы апарат.

Як рэарганізаваны апарат.

У розных галінах будаўніцтва рэарганізацыя акругі дае тыя ці іншыя зьявы. Калі ўзяць народную асьвету, дык мы тут бачым канчатковую дэцэнтралізацыю з дасканальным разьдзелам устаноў, якія падпарадкоўваюцца АВК, гарсавету і райвыканкомам. За Народным Камісарыятам Асьветы на Віцебшчыне застаецца толькі адзін вэтэрынарны інстытут.

Значна ўзмацнён апарат нарасьветы ў нізоўцы. Замест аднаго інспэктара нарасьветы, пры райвыканкоме ўстаноўлены дзьве пасады—інспэктара сацвыху і інспэктара налітасьветы. Упарадкавана справа з назначэньнем, перамяшчэньнем і звальненьнем работнікаў культасьветных устаноў.

Гэткія-ж прынцыпы пакладзены і ў аснову рэарганізацыі органаў аховы здароўя. Сацыяльная забясьпечка амаль ніякіх зьмен ня мае. Інспэкцыя працы пабудавана на тых-жа прынцыпах, як і ўвесь савецкі апарат—гэта значыць, што інспэктар працы праводзіць толькі інструктаж, а непасрэднае абслугоўваньне насельніцтва перададзена гарадзкім саветам і райвыканкомам. Узмоцнена работа па ахове працы сельска-гаспадарчых рабочых і батракоў. З гэтай мэтай у раёне павялічана колькасьць працаўнікоў. Біржа працы і кіраўніцтва працалектывамі перададзена ў веданьне гарсавету.

Значныя зьмены маюцца ў галіне судоў. Акруговыя суды амаль што перастаюць быць пачатковымі інстанцыямі ў разглядзе ўсіх спраў. Пашырана кампэтэнцыя сельскіх і таварыскіх судоў. Гэтаю сегкаю будзеахопліваць ня ўсё працоўнае насельніцтва; яны ўстанавліваюцца пры сельсаветах, установах, буйных жактах і гарсаветах. Унесена пэўная яскравасьць у сьледчую справу. Пакінута толькі 7 артыкулаў, па якіх неабходна папярэдняе сьледзтва. У сувязі з гэтым, пашыраны сьледчыя правы міліцыі. У кожным раёне ўстаноўлена пасада сьледчага.

У галіне грашовай галоўнейшыя мерапрыемствы зводзяцца к наступнаму. Усім сельсаветам дадзена права мець самастойныя бюджэты. Віцебскі гарадзкі савет атрымаў поўную самастойнасьць у фінансавай справе. Вялікая рэформа зроблена ў галіне вучоту крэдытаў. Дагэтуль у гэтай справе быў паралелізм. Ліквідаваны фінкантроль. Яго функцыі ўскладзены ў раёнах на старшынь раёных рэвізійных камісій, якія ў той-жа час зьяўляюцца і ўпаўнаважанымі РСІ. Пры кожным РВК уведзена адна штатная адзінка старшыні камісіі і ўпаўнаважанага РСІ.

У галіне земельных спраў трэба адзначыць ліквідацыю земельных камісій і перадачу земельных спрэчак у агульныя народныя суды.

Праведзена скасаваньне паасобных органаў дзяржаўнага страхаваньня. Райвыканкомам, сельсаветам і гарадзкім саветам перададзена ўся справа па дзяржаўнаму страхаваньню.

Новая сыстэма ўзмацніць савецкі апарат.

Адным з галоўных пытаньняў рэарганізацыі зьяўлялася пабудова структуры апарату. Стаяла задача, каб новая сыстэма дала магчымасьць, сапраўды, дасягнуць свае часовага і клясава-вытрыманага выкананьня дырэктыў партыі і ўлады. Апарат пабудаваны на прынцыпе адказных выканаўцаў. У апараце АВК застаецца 25 чалавек, у гарсавеце—100 і ў райвыканкомах—па 25-35 чал. У выніку рэарганізацыі значна паменшыўся акруговы апарат, а за яго лік значна ўзмацніўся апарат нізавы, у асаблівасьці гарсаветаў і сельсаветаў.

Рэарганізацыя акругі значна палепшыць пытаньне аб значным палепшаньні матар'яльнага становішча нізавых працаўнікоў: стаўка старшыні і сэкратара сельсавету з 28 руб. даведзена да 40 руб., старшыні РВК—з 90 да 120 руб., іншых працаўнікоў з 70 да 110 руб. Значнае павялічэньне ставак у сельсаветах і ў РВК дае магчымасьць прыцягнуць у нізавы савецкі апарат больш кваліфікаваных і вопытных працаўнікоў.

Папярэдні падлік каштоўнасьці новага апарату паказвае на некаторае падаражаньне яго, якое складае 88 тысяч руб., але калі ўзяць пад увагу павялічэньне ставак райённым працаўнікам і ўвядзеньне ў сельсаветы новых пасад статыстыкаў-рахункаводаў, дык мы атрымоўваем значную эканомію.

Асаблівасьці новага апарату заключаюцца ў тым, што ўсе працаўнікі АВК зьяўляюцца адказнымі выканаўцамі і выконваюць поўныя функцыі па загадзя выпрацаванай і складзенай функцыянальнай картцы. Гэткая сыстэма, бязумоўна, надае выразнасьць рабоце і зьнішчае безадказнасьць і безначальле, якое назіралася раней у аддзелах АВК. Сыстэма адказных выканаўцаў праведзена як у апараце акруговым, таксама і ў гарсавеце і ў раёнах. Пры новай сыстэме наркаматы павінны непасрэдна ўсе свае распараджэньні дасылаць у РВК і гарсаветы. Адбітак гэтых распараджэньняў, з мэтаю арганізацыі кантролю і праверкі выкананьня, дасылаецца ў АВК адпаведнаму інспэктару. Гэткая тэхніка работы бязумоўна палепшае кіраўніцтва з боку АВК усёй нізавой сеткаю савецкага апарату.

Асаблівае значэньне ў рэарганізаванай акрузе набывае пляніраваньне, якое зьяўляецца адной з галоўнейшых функцый рэарганізаванага АВК. У сувязі з гэтым перад Віцебскімі працаўнікамі паўстала ва ўсёй шырыні пытаньне аб увязцы вучоту з работай па пляніраваньні і ўтварэньні адпаведнай базы для пляніраваньня работы. Адарванасьць органаў статыстыкі ад органаў пляніраваньня прымусіла мясцовых працаўнікоў з усёй рашучасьцю паставіць пытаньне аб карэннай рэарганізацыі органаў пляніраваньня і вучоту, шляхам арганічнага іх зьліцьця ў адзінае пляніра-статыстычнае бюро, на чале якога стаіць намесьнік старшыні АВК. У мэтах каардынацыі пляніра-статыстычнай работы мэтадалёгічнае кіраўніцтва і забясьпечаньне статыстычных работ, рэспубліканскага і агульнасаюзнага значэньня пры кіраўніку пляніра-статыстычнага бюро, устаноўлена пасада намесьніка.

Пытаньні ўвязваньня вучоту і пляніраваньня, якія маюць вялічэзнае значэньне ў рэарганізаванай акрузе, патрабуюць сур'ёзнай прапрацоўкі, таму што Пляністатбюро ставіць перад сабой задачу рашучай і карэннай зьмены і спрашчэньне ставучоту, які прыстасаваны да патрэбаў пляніраваньня. Трохі ў гэтым напрамку ўжо зроблена: статыстычная справаздачнасьць спрошчана і скарочана на 50-60 проц., але гэтага мала. Работа па наладжваньні вучоту і ўвязваньні яе са справай пляніраваньня—яшчэ наперадзе.

Вялікае значэньне ў справе спрашчэньня справаздачнасьці і лепшага выяўленьня зьвестак, якія неабходны для апэрацыйнай работы сельсаветаў, РВК і аддзелаў выканкому, будзе мець уведзеньне ва ўсіх сельсаветах акругі падаровых карткі (разьлічана на 5 год), які ўключаць у сябе ўсе неабходныя зьвесткі па сельскай гаспадарцы, падаткам, руху насельніцтва і г. д. Распрацоўка даных гэтай падаровай карткі аслабаніць пляніра-статыстычнае бюро ад утварэньня цэлага шэрагу выбарачных абсьледваньняў, якія ў большай частцы ня поўна ацэньваюць адбіваюць абсьледваемыя зьявішчы. Для ўвядзеньня гэтай справаздачнасьці (у прыватнасьці падаровай карткі) ва ўсіх сельсаветах акругі ўстанаўліваюцца пасады статыстыкаў-рахункаводаў.

Хоць работа па рэарганізацыі акругі ўжо скончана і апарат ужо працуе па новай сыстэме, усе-ж па паасобных галінах мы сустракаемся з цэлым шэрагам няяснасьняў, зьвязаных, галоўным чынам, з дрэнным кіраўніцтвам з боку вышэйстаячых рэспубліканскіх органаў. На вялікі жаль наркаматы зусім не аддаюць увагі рабоце ўнову рэарганізаванага апарату. Як і раней, цякуць патокі цыркуляраў у акругу, абмінаючы раёны. Як і раней, інспэктарам—адказным выканаўцам замест выезду у раёны для кіраўніцтва, кантролю і інспэктыраваньня, прыходзіцца капаца ў грудах ведамсьцвенных папераў. Амаль месяц апарат працуе на новых рэйках, але да гэтага часу ніводзін наркамат Беларусі не пакланаціўся пазнаёміцца з новай пастаноўкай работы ў Віцебскай акрузе і даць належную дапамогу ў новай справе. Гэтаму зьявішчу трэба пакласьці канец.

Адначасова паўстае пытаньне аб людзкіх кадрах. Перакідваньне з акругі ў раёны 25-ці адказных працаўнікоў зьяўляецца недастатковым. Многія пасады па сёньняшні дзень пакінуты вакантнымі. Асабліва востра адчуваецца недахоп у спэцыялістах па сельскай гаспадарцы, па справе шляхаў і па пляніра-статыстычнай рабоце. Без дапамогі цэнтральных устаноў цяжка будзе абыйсьціся.

Вопыт, які праводзіцца ў Віцебскай акрузе, бязумоўна набывае ўсесаюзнае значэньне. Увага ўсёй грамадзкасьці, савецкай і партыйнай павінна быць зьвернута на ўдалае правядзеньне гэтага вопыту. Неабходна ў большай меры чым да гэтуль прыцягнуць да правядзеньня гэтага вопыту шырокія масы рабочых і працоўных сялян.

Эпштэйн.

НА ПЕРАЛОМЕ.

У ВІЦЕБСКАЙ ВОПЫТНА-ПАКАЗАЛЬНАЙ АКРУЗЕ.

пэньні XVI партканфэрэнцыі аб удаваньні і рэарганізацыі савец- апарату ў выглядзе вопыту ў 5 ах Саюзу „з тым, каб у канчат- м выніку лепшыя ўзоры зрабіць ладамі, абавязковымі для ўсіх", ктаваны самім жыцьцём і зьяў- а неадкладнай патрэбай.

раз, зразумела, яшчэ рана рабіць небудзь вынікі, бо яшчэ ня ў й меры скончыўся пераходны пэ- ад старой сыстэмы да новай, але самая спроба перабудаваньня са- га апарату ёсьць упаўне своечас- і правільная мера,—ні ў кога сумненьня.

о цяпер магчыма з упэўненасьцю рабіць вынік, што іспаваўныя ак- ыя аддзелы (Акрза, Акрфа і інш.) яліся лішняй і зусім непатрэбнай доўкай, лішним зьвяном у савец- апараце.

нтр усёй задачы перабудаваньня ату—узмацненьне райёну і сель- у, гэтых непасрэдных праваднікоў дырэктыў партыі і савецкай ула- гушчы мас. Увядзеньне ўва ўсіх аветах сельскіх бюджэтаў, узмац- не іх работнікамі, палепшаньне ўяльнага становішча работнікаў, ньне сельскіх судоў і значнае рэньне, наогул, правоў сельсаве- вось новыя мерапрыемствы, якія раюць падставу для рашучага па- аньня працы нізавой савецкай кі—сельскага савету.

ённы апарат пашыран колькасна ацнён якасна за кошт перакідкі значнай колькасьці акруговых нікаў. Ужо цяпер можна канста- ць вылявіўшыяся пералом у палеп- ні працы ўзмацнёнага раёну, хоць- а пасьпяховаму выкананьню зага- і інш. кампаній.

ытаньне рэарганізацыі абмяркоўвана пленумах сельсаветаў, на рабо- і сялянскіх сходах. Апрача гэтага, вязі з перакідкай значнай кольсьці акруговых работнікаў у раёны, былі праведзены ў 7 раёнах з 10 надзвычайныя раённыя зьезды саветаў.

Неабходна канстатаваць маючыйся вялікі інтарэс і вялікае здавальненьне рэарганізацыяй апарату з боку шырокіх мас.

У Віцебскай акрузе пабудован увесь савецкі апарат: акруговы і раённы па функцыянальна-вытворчаму прынцыпу, без якіх-небудзь арганізацыйна-адміністрацыйных падзяленьняў.

У адпаведнасьці з гэтым, кожны інспэктар кожнага сэктару (у сельска-гаспадарчым сэктары—8 інспэктароў, прамыслов. і працы—9, сацыяльна-культурным—9, абмен і фінансы—9) падпарадкаваны непасрэдна прэзыдыуму Акрвыканкому.

У раённым апараце няма таксама ніякіх структурных падзяленьняў, за выключэньнем адміістрацыйнага аддзяленьня. Кожны работнік раённага апарату непасрэдна падпарадкаван прэзыдыуму райвыканкому, альбо сябру прэзыдыуму.

У Віцебскай акрузе ў параўнаньні з іншымі 4-мя вопытнымі акругамі, дзе па асноўных галінах работы створаны акруговыя інспэкцыі, а ў раённых—аддзяленьні—зроблен крок уперад ў сэнсе рашучага зьнішчэньня якіх-небудзь структурных падзяленьняў.

Яшчэ 3 гады таму назад у БССР была праведзена частковая рэарганізацыя акруговага апарату, у выніку якой аддзелы народнай асьветы, аховы здароўя, сацыяльнай забясьпекі і працы былі ліквідаваны і замест іх створаны адпаведныя акруговыя інспэкцыі з адзінай абслугоўваючай канцылярыяй і бухгальтэрыяй акрвыканкому.

Цяпер-жа новая сыстэма пакідае пры прэзыдыуме АВК толькі інспэктароў па адпаведнай сурова вызначанай галіне працы, з устаноўкай—больш часу быць у раёне і сельсавеце. Гэта сыстэма, зразумела, сябе поўнасьцю апраўдае, бо «паколькі вузлавым пунктам, дзе ажыцьцяўляюцца дырэктывы партыі і савецкай улады, зьяўляецца раён, сюды неабходна перанесьці цэнтр цяжару працы па палепшаньню і выпраўленьню дзяржаўнага апарату» (з пастановы XVI партканфэрэнцыі).

Кіраваньне і пляніраваньне належыць прэзыдыуму акрвыканкому, пагэтаму надбудоўка ў выглядзе акруговай інспэкцыі са старэйшым інспэктарам на чале будзе лішняй і непатрэбнай.

Іншая справа—стварэньне пляніра-статыстычнага бюро.

Яго настраеньне ў Віцебскай акрузе належыць абмяркаваць таму, што на асноўнаму закону ЦВК СССР функцыі пляніраваньня застаюцца галоўнейшымі функцыямі акрвыканкому. Згодна паказанага закону пры акрвыканкоме стварацца пляніра-статыстычнае бюро і статыстычнае бюро. Згодна-ж пастановы ўраду БССР—акруговая пляніра-статыстычная камісія і статыстычнае бюро аб'яднаны ў „адзінае сталае пляніра-статыстычнае бюро пры акруговым выканаўчым камітэце".

Калі аб'яднаньне пляніра-статыстычнае бюро, як гэта паказана ў законе БССР, трэба разумець, як самастойную структурную адзінку з апэрацыйнымі функцыямі пляніраваньня і статыстыкі. У сапраўднасьці-жа гэтага няма. Усе пляніра-статыстычныя работнікі і статыстыкі распылены па сэктарах працы (прамыслов., сельска-гаспадарчы, сацыяльна-культурны і інш.) у розных пакоях, будучы зусім ня зьвязаны паміж сабою ў працы, з непасрэдным падпарадкаваньнем кожнага з 53 працаўнікоў-пляніравікоў і статыстыкаў аднаму з намесьнікаў старшыні акрвыканкому.

Гэткае настраеньне пляніравага і статыстычнага апарату, як гэта ўжо назіраецца ў сучасны момант, можа стварыць блытаніну і перабой у працы.

Другое пытаньне, на якім трэба спыніцца—гэта ліквідацы

Выпукліць кіруючую ролю індустрыі.

ПАСТАНОВА ГАЛОЎНАГА ВЫСТАВАЧНАГА КАМІТЭТУ

па дакладу дырэкцыі аб ходзе працы па падрыхтоўцы да 1-й Усебеларускай выстаўкі сельскае гаспадаркі і прамысловасьці.

Заслухаўшы даклад дырэкцыі аб ходзе падрыхтоўкі да выстаўкі Галоўвыстаўком адзначае:

1. Што дырэкцыяй праароблена ўжо значная праца па падрыхтоўцы самой тэрыторыі выстаўкі, як-та: падрыхтавана ўся плошча тэрыторыі да пасеваў, закладзены ўсе севазвароты і выпраўлены меўшыяся ў іх няправільныя ўстаноўкі на індывідуальныя гаспадаркі, пасаджан сад, ягадныя кусты, зроблена ўчарне значная частка павільёнаў.

Адначасова Галоўвыстаўком адзначае наступныя недахопы:

1. Лічыць зусім ненармальным зьявішчам, што ВСНГ да гэтага часу ня даў агульнага пляну па сэктару прамысловасьці, а шмат наркаматаў і арганізацый як-та: НКАсьветы, Сабез, Шлях. Кіраўн., Чыгунка, Пошта, НКУС, Ільнацэнтр і інш. не прадставілі сваіх меркаваньняў аб іх удзеле ў выстаўцы, а затрыманьне прысылкі матар'ялаў Полацкай і Аршанскай акруг па мясцовай прамысловасьці гаворыць аб зусім безадказнай працы інспэкцый і слабасьці працы Акрвыстаўкомаў.

2. Да гэтага часу дырэкцыя працуе без каляндарнага пляну працы, не дадзена па акругах канкрэтных інструкцый па некаторых аддзелах аб падрыхтоўцы экспанатаў мясцамі і поўнага грашовага каштарысу па акрузе, дзякуючы нясур'ёзным адносінам з боку значнай часткі загадчыкаў, якія не прадставілі іх Дырэкцыі і зьмене некаторых загадчыкаў аддзелаў і п аддзелаў.

3. Агульны плян, складзены Дырэкцыяй, не прадугледжваў усіх момантаў па будаўніцтву (прапушчана пабудова каратыну для жывёлы, хлявоў для кармоў, сродкі на прэмі і г. д.) а загадчыкі аддзелаў ня досыць сур'ёзна падыходзілі пры вызначэньні разьмераў павільёнаў і ўнутранага разьмеркаваньня, што ў далейшай працы выкаікала неабходнасьць перарабленьня і пабудову дадатковых павільёнаў.

4. Акруговымі ўстановамі і арганізацыямі вельмі мала зьвернута ўвагі на справу падрыхтоўкі экспанатаў. Ня ўсюды пры сельсаветах арганізаваны выстаўкомы, а акрвыканкомы да гэтага часу ня вылучылі спэцыяльных, вольных ад іншай працы, працаўнікоў па выстаўкому.

5. Дзяржбудам нездавальняюча праводзіцца складаньне праэктаў павільёнаў і само будаўніцтва.

6. Не распрацован плян экскурсій, іх абслугоўваньне як на самой выстаўцы тлумачэньнямі, гэтак і кватэрамі і інш.

7. Да гэтага часу дырэкцыяй ня зьвернута ўвага на арганізацыю навакол выстаўкі думкі рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, поўнасьцю ня выкарыстана мажлівасьць папулярызацыі ідэі выстаўкі сярод сялян у Доме Селяніна. (зроблена ўсяго 2 даклады) і ня выпушчана ніводнае брашуры і плякату, ня выкарыстана кіно і радыё ў мэтах папулярызацыі выстаўкі.

8. Культасьветныя ўстановы і арганізацыі не разгарнулі тлумачальнай працы, як у горадзе сярод рабочых, гэтак і асабліва на вёсцы сярод бядняцка-серадняцкіх мас. Прафарганізацыі дагэтуль не арганізавалі абгаварэньне задач выстаўкі і падрыхтоўкі яе на рабочых калектывах.

9. Цэнтральныя газэты да апошняга часу мала зьвярталі ўвагі выстаўцы, а акруговыя нават да гэтага часу амаль не пачалі асьвятляць, як ход падрыхтоўкі, гэтак і перашкоды праз друк.

Выходзячы з гэтага, пленум галоўвыстаўкому пастанаўляе:

1. Дырэкцыі даручыць ВСНГ і НКЗ паставіць працу так, каб кіруючая роля індустрыі ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі была асабліва выпуклена на выстаўцы і каб уся выстаўка была накіравана на паказ працоўным працэсу і пераходу ад раздробленай сялянскай гаспадаркі да буйнага калектыўнага земляробства, з такім разьлікам, каб на выстаўцы зьвярнуць асаблівую ўвагу аграмаджанаму сэктару сельскае гаспадаркі; павільёны па жывёлагадоўлі і асабліва іх унутранае абсталяваньне павінны быць такімі, якія неабходна раіць буйным калектыўным і савецкім гаспадаракам. Асабліва выпукліць новы быт у калектыўных гаспадарках шляхам параўнаньня з бытам і індывідуальнай сялянскай гаспадаркі. Разам з гэтым даручыць дырэкцыі прадбачыць папулярызацыю пяцігодкі, як у кожным аддзеле паасобку, гэтак і адводам спэцыяльнай плошчы ў галоўным павільёне.

Абавязаць ВСНГ і інш. наркаматы і арганізацыі закончыць складаньне агульнага пляну і каштарысу не пазьней 10-га лістапада г. г.

3. Абавязаць усіх загадчыкаў аддзелаў на працягу 5 дзён скласьці і падаць Дырэкцыі каляндарны плян працы аддзелаў, падрабязныя інструкцыі месцам па падрыхтоўцы экспанатаў па ўсіх галінах і разьмеркаваньне сродкаў па кварталах, а дырэкцыі тэрмінова скласьці агульны каляндарны плян і разасласць акругам, з каштарысам для кожнай акругі.

4. Абавязаць акрвыстаўкомы надаць больш увагі справе падрыхтоўкі экспанатаў для выстаўкі, усім акрвыканкомам вылучыць, для працы ў выстаўкоме спэцыяльнага, адпаведнага прадстаўніка, аслабанёнага ад іншай працы, для хутчэйшай распрацоўкі акруговых плянаў.

5. Прапанаваць Дзяржбуду ўсю працу па будаўніцтву выстаўкі весьці ў па-за чарговым парадку з разьлікам сканчэньня яе да тэрміну.

6. Тэрмінова прыступіць разам і прафсыянальнымі і грамадзкімі арганізацыямі да распрацоўкі пляну экскурсій на выстаўку, іх спатканьня і абслугоўваньня, вызначэньня для іх кіраўнікоў здольных азнаёміць экскурсантаў-сялян з новымі мэтадамі вядзеньня сельскае гаспадаркі і ўстаноўкай партыі і ўраду на шырокую індустрыялізацыю краіны.

7. Дырэкцыі выстаўкі ў месячны тэрмін выпусьціць некалькі плянаў з мэтай папулярызацыі выстаўкі. Прасіць ЦСПС у бліжэйшы тыдзень арганізаваць абгаварэньне сярод рабочых па прадпрыемствах гораду, а акрвыканкомам у акругах ход падрыхтоўкі да выстаўкі і растлумачэньне задач выстаўкі. Максымальна выкарыстаць Дом Селяніна, кіно і радыё для папулярызацыі ідэі выстаўкі, паскорыць выпуск брашуры аб выстаўцы.

Абавязаць Наркамасьветы праз культасьветныя ўстановы, як у гарадох, гэтак і на вёсках, шырока разгарнуць тлумачальную працу аб ідэі выстаўкі і падрыхтоўкі да яе.

Даручыць дырэкцыі ў бліжэйшы час выдаць брашуру: „Што павінен рабіць рабочы калектыў да падрыхтоўкі да выстаўкі і яе папулярызацыі".

8. Абавязаць усіх загадчыкаў аддзелаў і акрвыканкомы ў бліжэйшыя дні пачаць асьвятленьне ў друку, што робіцца аддзеламі ў падрыхтоўцы да выстаўкі і якія перашкоды ў гэтым, а цэнтральным і акруговым газэтам арганізаваць вакол асьвятленьня задач выстаўкі і яе падрыхтоўкі рабселькораўскія масы, больш сыстэматычна асьвятляючы ход падрыхтоўкі ў друку.

9. Даручыць дырэкцыі выстаўкі тэрмінова выправіць усе заўважаныя недахопы працы, а для разьяшчэньня экспанатаў чыгункі прадставіць неабходную плошчу ў павільёне, дзе разьмяшчаецца шляхавая гаспадарка.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кнігі выданьня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

1. „МОЛАДЗЬ—ЗА НОВЫ БЫТ". Зборнік для масавага чытаньня. Зложыў М. Сеурук. Стар. 72, цана 35 кап.

2. „ЗА КАЛГАСЫ". Аграном С. Кудзінаў. Стар. 40, цана 8 кап.

3. „СЬМЕХІ І РАДАСЬЦЬ ВЁСКІ". Песьні, вершы і частушкі. Захар Бульбанік. Стар. 86, цана 30 кап.

4. „АПЛАТА ПРАЦЫ Ў КАЛГАСАХ", М. Цынкоў, С. Кудзінаў. Стар. 62, цана 10 кап.

5. „ТРАКТАР БУДЗІЦЬ РАНЬНЕ". Ул. Паскрэбка. Стар. 68, цана 10 кап.

Асноўныя задачы Беларускага Навукова-Дасьледчага Інстытуту Прамысловасьці.

(Гутарка з нам. старшыні арганізацыйнага камітэту прафэсарам Серада).

Перад Беларускім Навукова-Дасьледчым Інстытутам Прамысловасьці стаяць задачы: прапрацоўваць пытаньні навукова-дасьледчага парадку, унесеныя ў плян працы пад'аддзелаў інстытуту па ўзгадненьню з прамысловасьцю, распрацоўваць пытаньні дасьледчага парадку, якія будуць ставіць перад інстытутам ВСНГ, трэсты і прадпрыемствы. Побач з гэтым Інстытуту прыдзецца выконваць усе лябараторна-іспытацельныя працы па заказах асобных трэстаў, прадпрыемстваў, устаноў і ВСНГБел. Выкананьне гэтых прац тлумачыцца тым, што ў БССР ні на фабрыках, ні ў трэстах няма добра абсталяваных лябараторый, якія маглі-б выконваць заданьні месц. Арганізоўваць зараз на мясцох лябараторыі немагчыма таму, што няма дастаткова кадраў спэцыялістаў для ўкамплектаваньня цэлага шэрагу лябараторыяў, няма таксама лябараторнага абсталяваньня. У будучыне, калі будуць падрыхтаваны адпаведныя кадры, калі прадпрыемствы пашырацца да такіх разьмераў, што будуць мець магчымасьць арганізоўваць свае лябараторыі, дык гэта праца інстытутам будзе перададзена мясцом.

У ВСНГ, трэстаў і прадпрыемстваў у працэсе іх працы будзе ўзьнікаць цэлы шэраг пытаньняў навукова-дасьледчага парадку, якія будуць зьяўляцца надзвычайна жыцьцёвымі для прамысловасьці, але якія бяз глыбокай навуковай і лябараторнай распрацоўкі разьвязаць ня змогуць, дык разьвязаньне гэтых пытаньняў таксама прыдзецца ўзяць на сябе Інстытуту.

У мэтах найлепшага абслугоўваньня беларускай прамысловасьці і каардыраваньня працы Інстытуту з адпаведнымі Навукова-Дасьледчымі Інстытутамі ВСНГ СССР, Беларускі Навукова-Дасьледчы Інстытут прамысловасьці будзе мець сем пад'аддзелаў: 1) Лясной, дрэваапрацоўваючай, запалкавай і паперовай прамысловасьці; 2) Вывучэньня торфу; 3) Мінэральнай тэхналёгіі; 4) Арганічнай тэхналёгіі; 5) Энэргэтыкі; 6) Эканомікі і рацыяналізацыі прамысловасьці і 7) Хэміка-аналітычнай лябараторыі.

Апрача таго пры Інстытуце павінна быць сталая прамислова-паказальная выстаўка, на якой будуць прадстаўлены ня толькі гатовыя вырабы прамысловасьці, але паказаны на ўзорах, схэмах і мадэлях увесь ход кожнай вытворчасьці, пачынаючы ад сыравіны і канчаючы гатовымі фабрыкатамі. Гэта выстаўка будзе мець вялізарнае значэньне для навучальных устаноў, экскурсій, чытаньня лекцый аб прамысловасьці Беларусі і г. д. Пры інстытуце павінны быць лекцыйныя залі для чытаньня лекцый экскурсіям, рабочым з вытворчасьці, ніжэйшаму тэхнічнаму пэрсаналу і г. д.

Апрача вышэйпаказаных пытаньняў Інстытут будзе прапрацоўваць пытаньні перакваліфікацыі ніжэйшага тэхнэрсаналю для ўкамплектаваньня прадпрыемстваў прамысловасьці, а таксама па падрыхтоўцы кадраў кваліфікаваных рабочых і ніжэйшага тэхнэрсаналю.

Для ўкамплектаваньня інстытуту асабовым складам, быў абвешчан конкурс На конкурс пададзена цэлы шэраг заяў, з якіх маецца частка вельмі сур'ёзных прапаноў прафэсароў ВНУ і працаўнікоў прамысловасьці, якіх можна будзе скарыстаць для працы ў інстытуце. Усяго для інстытуту патрэбна да 100 працаўнікоў, але ў сувязі з адсутнасьцю памяшканьня для разьмяшчэньня лябараторый інстытуту, увесь штат поўнасьцю ў 1929-30 годзе запоўнен ня будзе.

У сучасны момант пытаньне з разгортваньнем работ інстытуту ўпірасецца ў адсутнасьць належнага памяшканьня. Калі інстытуту ня будзе прадастаўлена дастатковае памяшканьне для разьмяшчэньня лябараторый, дык ён сёлета ня зможа разгарнуць працы.

З вясны 1930 году мяркуецца распачаць пабудову на Камароўцы спэцыяльнага будынку для інстытуту з усімі лябараторыямі і спэцыяльнымі ўстаноўкамі. Арганізацыйны камітэт пастанавіў утварыць спэцыяльную камісію для распрацоўкі пляну будынка інстытуту, дзе можна было-б разьмясьціць усе яго аддзелы.

У заключэньне трэба сказаць, што інстытут прамысловасьці ў сучасны момант у вельмі цяжкіх умовах праводзіць бягучую дасьледчую працу па заданьнях асобных трэстаў, аддзелаў ВСНГБ, а таксама іншых устаноў.

ХРОНІКА

У цэнтральнай камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчаднай справе.

Учора пад старшынствам тав. Хацкевіча адбылося пасяджэньне цэнтральнай камісіі садзейнічаньня дзяржаўнаму крэдыту і ашчаднай справе.

Як ужо вядома, 20-22 лістапада ў Віцебску адбудзецца чарговы тыраж выйгрышаў па 1-й пазыцы індустрыялізацыі. У зьвязку з тым, што ў гэты час у Менску будзе адбывацца Сэсія ЦВК БССР, цэнтральная камісія пастанавіла зьвярнуцца з просьбай у Прэзыдыум ЦВК аб вылучэньні групы членаў ЦВК,—галоўным чынам, рабочых і сялян для ўдзелу ў правядзеньні тыражу. Побач з гэтым пастаноўлена зьвярнуцца да ўсіх грамадзкіх арганізацый Віцебску з заклікам прыняць актыўны ўдзел у падрыхтоўчай да тыражу працы.

17 лістапада на прэзыдыуме ЦВК будзе стаяць даклад цэнтральнай камісіі садзейнічаньня аб яе працы. Даклад на пасяджэньні прэзыдыуму ЦВК камісія даручыла зрабіць тав. Буніну.

У Прэзыдыуме Менскага Акрвыканкому.

Падрыхтоўка да перавыбараў саветаў.

На апошнім пасяджэньні Прэзыдыуму Менскага акрвыканкому зацьверджан склад акруговай выбарчай камісіі для правядзеньня перавыбараў сельсаветаў у 1930 годзе. Старшыня камісіі тав. Аксючыц.

Побач з гэтым Прэзыдыум АВК вылучыў старшынь райвыканкомаў старшынямі райённых выбарчых камісій. Райвыканкомам запрапанавана да 25 лістапада ўтварыць новыя райённыя выбарчыя камісіі, а гарадзкія, местачковыя і сельскія выбарчыя камісіі павінны быць арганізаваны да 1 сьнежня.

Нарада райінспэктароў.

Прэзыдыум АВК дазволіў акруговай інспэкцыі нарасьветы склікаць 1 сьнежня нараду райённых інспэктароў нарасьветы. Нарада абгаворыць пытаньні аб увядзеньні ўсеагульнага навучаньня, аб ліквідацыі няпісьменнасьці і аб дапамозе дзецям беднаты.

Праэкт новага зямельнага кодэксу на абгаварэньне мас.

Прэзыдыум Менскага АВК пастанавіў арганізаваць шырокае абгаварэньне працоўнымі масамі праэкту зямельнага кодэксу.

Арганізацыя гэтай кампаніі ўскладзена на загадчыка АКРЗ'а тав. Карапеўскага, якому даручана скласьці плян яе правядзеньня і прадставіць на зацьверджаньне АВК.

Канфэрэнцыя груп беднаты.

Сёньня ўвечары адчыняецца Менская акруговая канфэрэнцыя груп беднаты. У цэнтры працы канфэрэнцыі—даклад аб 5-цігадовым пляне разьвіцьця народнай гаспадаркі Саюзу і БССР з канкрэтным вызначэньнем задач для Меншчыны. Абгаворыць канфэрэнцыя і пытаньне аб удзеле беднаты ў перавыбарах сельсаветаў і камітэтаў сялянскіх т-ваў узаемадапамогі. У парадку дню канфэрэнцыі стаіць таксама пытаньне аб выніках работы па рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Фізкультура і спорт.

Зімовае сьвята фізкультуры.

Прэзыдыум ВСФКБ зацьвердзіў плян правядзеньня ўсебеларускага сьвята фізкультуры, перад якім будуць праведзены акруговыя спаборніцтвы па розных відах спорту.

Ва ўсебеларускім зімовым сьвяце прымуць удзел 800 фізкультурнікаў.

Сацыялістычнае спаборніцтва паміж фізкультурнікамі.

ВСФКБ на сваім апошнім пасяджэньні зацьвердзіў тэкст сацдагавору паміж фізкультурнікамі Беларусі і западнай вобласьці.

Згодна дагавору лік фізкультурнікаў па Беларусі да 1 кастрычніка 1930 г. павінен быць павялічан на 50 проц. На прадпрыемствах з ліку ФК павінны быць арганізаваны 20 ударных брыгад, беларускія фізкультурнікі павінны сабраць на пабудову самалёту „Савецкі ФК" 3 тысячы руб., зарадкавай гімнастыкаю ахапіць 3 тысячы рабочых, ня менш 50 гурткоў павінны быць арганізаваны ў калгасах і г. д. Тэкст дагавору накіроўваецца ў г. Смаленск.

„САВ. БЕЛАРУСЬ" РАСЬСЬЛЕДВАЕ

Склад арцелі адноўлен.

У рэдакцыю паступіў матар'ял адносна засьмечанасьці прамысловай арцелі „Спайка".

Гэты матар'ял рэдакцыя накіравала камісіі па чыстцы прамысловых арцеляй.

Водлуг вестак атрыманых ад камісіі на чыстцы, матар'ял поўнасьцю скарыстан пры чыстцы арцелі „Спайка".

Чужыя людзі паказаныя ў допісах з арцелі звольнены.

Абвешчана вымова.

Допіс пад загалоўкам „Паднімем урджайнасьць" зазначаў, што на мопраўскай палосцы у вёсцы Мілашэвічах, старшыня сельсавету Каўбеня і старшыня СКСТ Дубравец пасуць скот.

Рассьледаваньнем факты пацьвердзіліся, віноўным абвешчана вымова.

Ачысьціліся ад кулацтва.

Па сутнасьці допісу зьмешчанага газэце „Савецкая Беларусь" п... лоўкам „Кулацкага ідэолёга вон... радоў" Аршанскі Акруговы В... Камітэт паведамляе, што „гэрой... інструктар аршанскай проф... Драздоў з працы зьнят.

Склад сельсавету абн...

У допісе „Грубае скрыўленьне ... вай лініі" пасланым на рассьледв... ведамдялася, што старшыня с... Аксючыц п'янствуе і робіць зл... Расьледаваньнем Лагойскага РВ... зазначаныя у допісе поўнасьцю ... дзіліся. Зараз склад сельсавету ... Віноўныя прыцягваюцца да к... най адказнасьці.

Рабселькоры нам пішуць.

Трэба прасьнуцца.

Ня гледзячы на тое, што па ўсіх сельсаветах Калінкавіцкага раёну, Мазырскае акругі падпіска на 3-ю пазыку ужо канчаецца, Аудзіцкі сельсавет яшчэ за распаўсюджаньне пазыкі ня ўзяўся як-следа. Сялянства мала ведае аб пазыцы, бо ячэйка КП(б)Б, сельсавет і настаўніцтва і да гэтае пары сьпяць непрабудным сном.

Падпішчык.

Аграном у хвасьце.

У Калінкавіцкім раёне, Мазыр... ругі за апошні час шырока раз... калгасны рух. Беднота цэлымі ... падае заявы аб уступленьні ў ... За ёй ідуць сераднякі.

У вёсцы Насовічы акруговы ... Акуліч Базыль, які прыяжджае ... бацькоў, замест тлумачэньня сял... калектывізацыі, ён не гаворыць ...

Я. Б...

Кіно „Культура".

Цэмэнт.

Картіна ня толькі паўтарыла памылкі Гладкоўскага раману, але яшчэ пашырыла і „паглыбіла" іх. Спробы псыхалёгізму ў Гладкова пацярпелі няўдачу. У вобразе Дашы не хапае дакладнасьці, ад чаго там сям характар яе атрымоўваецца няроўным, малападобным. Сумна паданы Глеб, у якім таксама вельмі мала матываваний эвалюцыйнасьці. Усё-ж Гладкоў намячае складанасьць чалавечай псыхікі.

Глеб у яго „добры ваяка і дрэнны камуніст у жыцьці" (словы Дашы). Ён ня можа перамагчы ў сябе буржуазнай спадчыны—пачуцьця ўласнасьці над жанчынай. У ім ёсьць толькі памёкі на новага чалавека, але новы чалавек з 'яго ўсё-ж ня выкоўваецца. І вось гэтая барацьба адданага камуніста з коснасьцю бытавых устояў у Чумалаве ў карціне ня выяўлена.

Даша замест жанчыны з моцным характарам выйшла неразважаючай, дурнаватаю бабаю.

Нематываванасьць яе ўчынкаў ... ся той самай, што і ў Гладкова, ... таго каб абгрунтаваць і ўзмаціць ... слабое месца ў рамане.

Уся вострасьць узаемаадносін ... ва з Дашаю ў фільму сьцёрта. ... робіць уражаньне рэчы, зробле... сьнех, па дрэнным шпаргалцы, д... няўдалы.

Сяргей уводзіцца ў фільм, як ... эпізод, але ня маючы ніякіх ад... разьвіцьця дзеі. Увесь фільм ад... і незакончаны. Часткі дзеі, нават ... сягнуўшы свайго разьвіцьця, ... вісець у паветры.

Чым кончылася сутычка Чум... Дашы? У якой пасьлядоўнасьці ... явілася? — невядома.

Адзінае, паказанае больш-менш ... ў фільму—гэта аднаўленьне завод... асяродак і быт вельмі замазаны ...

Гэта самы дрэнны спрошчаны ...

С. А...

Апавяшчэньні.

— АПА Менскага АККП(б)Б паведаляе, што ў нядзелю 17 лістапада, а 7 з пал. гадз. увеч. у Доме Камасьветы імя К. Маркса адбудзецца вечар нізавога партыйнага, камсамольскага і беспарт. рабоч. актыву. Даклад нам. стар. ВСНГ на тэму: „5-цігадовы плян індустрыялізацыі БССР і задачы сацспаборніцтва". Пасьля дакладу—мастацкае аддзяленьне. Уваход па білетах раздадзеных па ячэйках.

— Камунізэрсытэт Беларусі імя У. І. Леніна паведамляе ўсіх членаў партыі, што прыём заяў для паступленьня ва Унівэрсытэт працягнуты да 1-га сьнежня г. г.

Усім жадаючым паступіць неабходна ў гэты тэрмін падаць заявы, згодна ўмоў прыёму (гл. „Зьвязда" ад 25-VI—29 г. № 142).

ПРАЎЛЕНЬНЕ КУБ.

— Праўленьне Камунаўнівэрсытэту ... Русі імя У. І. Леніна паведамляе, ... наступным 1930-31 навуч. годзе ... ны дадатковы набор слухачоў ... (асноўны) нуро Унівэрсытэту.

Прымацца на гэты нуро будуць ... адпавядаючыя агульным умовам ... ступленьня ў КУБ і маючыя адп... агульна-адукацыйную падрыхтоўк... чыўшыя Савпартшколу II ступені, ... ніа Рабфакі, Агульна-адукацыйны... сы і інш.

Прыём заяў праводзіцца пр... КП(б)Б да 1-га сьнежня 1929 г.

ПРАЎЛЕНЬНЕ Б...

— Завочныя курсы партактыву п... унівэрсытэце Беларусі імя У. І. ... паведамляюць, што заданьні па г... слухачамі прадметам будуць выс... непасрэдна курсамі кожнаму слух... кладной платай".

— Завочны Камуністычны Унівэр... пры Камунівэрсытэце Беларусі ім... Леніна гэтым паведамляе, што імі ... дзіцца прыём слухачоў Унівэрсыт... 1-шы і 2-гі курсы.

Падрабязныя зьвесткі аб умовах ... му і вучобы маюцца ў спэцыяльны ... ніку (праспэкце) ЗКУБ, які высылае ... запатрабаваньню пры высылцы па... марак на 30 кап..

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК.

на 15-ае лістапада 1929 г.

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	5.01,5	—
Бясп роц. выйгр. паз. 26 г.	129.00	131.00
Выйгр. пазыка 1929 г. .	101.15	101.55
10 проц. выйгр. паз. 27 г.	25.63	25.73
3-я сялянск. выйгр. паз. 27 г.	5.05	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.45	10.80
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25,55,5	25.65,5
2 „ „ „ проц.	25.57	25.67
2 „ „ „ 6-проц.	25.57	25.67
1 проц. дз. паз. 1928 г.	102.32	102,37
12 пр. рэнтн. паз. 1927 г.	105.47	—

Адказны рэдактар П. ШАСТАК.

ТЭАТР-КІНО

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА". З панядзелка 11 лістапада буйны мастацкі фільм „ЦЭМЭНТ". Звыш праграмы: КІНО-ХРОНІКА. Пачатак а 7 гадзіне.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». З панядзелка 11 лістапада Амэрыканскі фільм „НЕБАСКРОБ" у 6 частках. Звыш праграмы: ХРОНІКА САВКІНО № 60. Пачатак а 7 гадзіне.

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ". З панядзелка 11 лістапада „АПОШНІ АТРАКЦЫЁН" у 6 частках. Звыш праграмы: КІНО-ХРОНІКА САВКІНО № 62. Пачатак а 7 гадзіне.

1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР". З панядзелка 11 лістапада „ВАСЯ РЭФАРМАТАР" у 6 частках. Каса адчынена з 2 гадз.)—(Цана білету 10 кап.

НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ ГАНДЛЮ БССР, ПА ДАРУЧЭНЬНЮ ЭКАНА БССР, гэтым даводзіць да ведама, што 13-го лістапада г. г. зацьверджан статут УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬМЕШАНАГА АКЦЫЙНАГА ТАВАРЫСТВА ПА СНАБЖЭНЬНЮ СЕЛЬСКАЕ ГАСПАДАРКІ СРОДКАМІ ВЫТВОРЧАСЬЦІ „БЕЛСЕЛЬХОЗСНАБ" з месцазнаходжаньнем праўленьня ў г. МЕНСКУ. СТАТУТНЫ КАПІТАЛ ТАВАРЫСТВА 2.500.000 рублёў. Мэта таварыства: снабжэньне сельскае гаспадаркі БССР сродкамі вытворчасьці.

НАМ. НАРКАМГАНДЛЮ БССР АБРАМСОН М.

АДКРЫТА НА 1930 г. ПАДПІСКА НА ПЭРЫЯДЫЧНЫЯ ВЫДАНЬНІ ДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА „ПЫТАНЬНІ ПРАЦЫ" „ГОСТРУДИЗДАТ" НА ЧАСОПІСІ:

„ВОПРОСЫ ТРУДА" выходзіць штомесячна —) ПАДПІСНАЯ ЦАНА)— На 1 год . . . 12 р. „ 9 м. . . . 9 „ „ 6 м. . . . 6 „ „ 3 м. . . . 3 „

„ИЗВЕСТИЯ НКТ СССР" афіцыйнае выданьне, выходзіць кожны дзень —) ПАДПІСНАЯ ЦАНА (— На 1 год . . . 4 р. 50 к. „ 9 мес. . . 3 р. 75 к. „ 6 мес. . . 2 р. 50 к. „ 3 мес. . . 1 р. 25 к.

„ВОПРОСЫ СТРАХОВАНИЯ" штотыднёвая часопісь па сацстрахаваньню —(ПАДПІСНАЯ ЦАНА)— На 1 год . . 10 р. 80 к. „ 9 м. . . 9 р. — „ 6 м. . . 6 р. — „ 3 м. . . 3 р. —

„ГИГИЕНА И БЕЗОПАСНОСТЬ ТРУДА" выходзіць штомесячна —) ПАДПІСНАЯ ЦАНА: (— На 1 год . . . . . 12 р. „ 9 м. . . . . 9 р. „ 6 м. . . . . 6 р. „ 3 м. . . . . 3 р.

„ТРУДОВОЙ ПОСРЕДНИК" штотыднёвы бюлетэнь рынку працы —) ПАДПІСНАЯ ЦАНА: (— На 1 г. . . . . 3 р. „ 9 м. . . . . 2 р. 25 к. „ 6 м. . . . . 1 р. 50 к. „ 3 м. . . . . — 75 к.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: У ГОР. МЕНСКУ—Беларускім аддз. дзярж. выдавецтва „Пытаньні Працы" Гоструздиздат, Пляц Волі, 23, тэл. 13-46, яго ўпаўнаважанымі, таксама газэтн. бюро Бел. Кір. Сувязі. У АКРУГАХ БССР—акруговымі разьносчыкамі пры інспэкцыях працы і спэцыяльнымі упаўнаважанымі.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЭЛЕКТРАТЭХНІЧНЫ ТРЭСТ ГЭТ Менскае мантажна-гандлёвае аддзяленьне МЕНСК, Савецкая вул. д. № 68-29, тэл. № 4-90. ВЫТВАРАЕ НА БЕЛАРУСІ І Ў СМАЛЕНСКАЙ ГУБЭРНІ РСФСР РОЗНЫЯ МАНТАЖНЫЯ РАБОТЫ. ВЫРАБЛЯЕ І БЯРЭ ПАСТАЎКІ І ЗАКАЗЫ НА РОЗНЫЯ ЭЛЕКТРАМАТАР'ЯЛЫ, апаратуру, машыны і вырабы ўласных і чужых заводаў ВЫСОКА І НІЗКА-ВОЛЬТНЫЯ. СКЛАДАЕ ПРАЭКТЫ ЭЛЕКТРАПАБУДАВАНЬНЯЎ ПА ГАРАДЗКОЙ, ПРАМЫСЛОВАЙ І СЕЛЬСКАЙ ЭЛЕКТРАФІКАЦЫІ, ПРАЭКТУЕ, БУДУЕ І МАНЦІРУЕ РОЗНЫЯ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ. Мае філіялы (інжынэрныя бюро): у г. г. ГОМЕЛІ І СМАЛЕНСКУ.

Абавязковая пастанова № 39

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх дэпутатаў.

12 лістапада 1929 г.

У мэтах дабрабыту гораду і аховы вуліц, шляхоў і пляцоў ад п... ваньня, Менскі Гарадзкі Савет Р., С. і Ч. Д. пастанаўляе:

1. Забараніць на тэрыторыі гор. Менску дзяржаўным устаноў... і прадпрыемствам і іншым арганізацыям, а таксама прыватным асо... копку гліны, пяску, гравія і іншага без дазволу Камгасу.

2. Камгасу для копкі памянёнага адвесьці пэўныя месцы—ка... еры і выдаваць дазволы па раскопку толькі ў іх.

3. Асобы, вінаватыя ў парушэньні гэтае абавязковае пастаноў... падлягаюць пакараньню ў адміністрацыйным парадку—штрафу да 1... руб., ці прымусовым работам да аднаго месяца.

4. Нагляд за выкананьнем гэтай абавязковай пастановы ўсл... даецца на міліцыю і Камгас.

5. Гэтая пастанова ўваходзіць у сілу праз 7 дзён з дня апуб... каваньня.

Нам. старшыні Менскага Гарадзкога Савету КРУЗМАТ.

Сакратар Менскага Гарадзкога Савету ПАСЫНКОЎСКІ.

ПАТРЭБНЫ вопытныя і спрактыкаваныя АГЭНТЫ па распаўсюджваньню часопісі „Узвышша" па Менску і на мясцох.

За працу па згодзе будзе выплачвацца альбо стала... пэнсія (120 руб.), альбо процанты.

Зьвяртацца вусна ці пісьмова ў рэдакцыю «Узвышша» (Савецкая, 68, Дом Пісьменьніка).

ЗГУБЛЕНЫ:

— Вайсковы білет Валодзька П. М., выд. Чэрвенскім вайсковым сталом, кв. 12п.

— Конская карт. Цепленка П. Я., выд. Чэрвенскім вайсковым сталом, кв. 13-п.

— Службовая кніжка вайскова-абавязанага № 2184 Семяненка І., выд. Каралінскім РВК, кв. 67п.

— Сяброўскі білет № 697 Жучкоўскага В., выд. Мазырск. саюзам працасьветы, кв. 68п.

— Асабовая кніжка Дземеньцьева А. І. выд. Ірупскім РВК, кв. 49п.

— Чырвонаарм. кніжка Бандаровіча І., выд вайсковым сталом рудніка Карла Маркса Арцемаўск. акр., кв. 11п.

— Вучотна-конская карт. Касьце... В. М., выд. Чэрвенскім вайсковым ста... кв, 14п.

— Пашпарт Падскробкі Ф. К., ... Чэрвенскай міліц., кв. 15п.

— Дапрызыўная кніжка Слабод... М. А. парадж. 1905 г., выд. Мазы... ваенкаматам, кв. 16п.

— Вайсковая кніжка № 1450 Духа... І., выд. Лельчыцкім РВК, кв. 17п.

— Вайсковая кніжка Гайдукевіча ... выд. Шацкім с-с Пухавіцкага райв... кв. 50п.

— Вучотна-вайсковая кніжка Тама... ка Я., выд. у Клінцах, Бранскай губ... № 3038 аб сканчэньні вайсковай слу... ў 37 арт. палку, кв. 52п.

Галоўлітбел 595.

Друкарня БДВ